Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ, САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
10 жніўня 1931 г.
№ 183 (3272)

ПА-БАЯВОМУ ПЕРАБУДАВАЦЦА, ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН

Мы ўступілі ў другую палову 3-га гадавога гаду пяцігодкі. Гэты год вызначаецца рашаючым годам для выкананьня задач настаўленых партыяй і ўрадам—ажыцьцявіць пяцігодку ў 4 гады.

Гарантыяй ажыцьцяўленьня гэтых задач зьяўляецца той факт, што мы на раду буйнейшых прадпрыемстваў БССР не за пяць і не за чатыры, а за 3 і нават за 2 з паловай гады выканалі пяцігодку. Да такіх прадпрыемстваў адносяцца: Менскі Чырвонасцяндарны завод «Бальшавік», Гомельская Электрастанцыя, Палесдрук. Услед за імі ідзе шэйная прамысловасьць, якая ўжо амаль выканала свой прамфінплян першага паўгодзьдзя трэцяга рашаючага году.

На прадпрыемствах БССР створаны тысячы ўдарных брыгад імя 518 і 1040, якія з вялікім энтузіязмам штурмуюць вышыні пяцігодкі. Калгаснае сялянства ў СССР стала цьвёрдай апорай партыі і ўлады на вёсцы—цэнтральнай фігурай земляробства.

Ня гледзячы на вялізарнейшыя дасягненьні, якіх дамаглася рабочая клясa БССР у першым паўгодзьдзі, мы ўсё-жа за апошні час на асобных прадпрыемствах маем значныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну. Асноўная прычына гэтых прарываў—апартуністычнае няўменьне з боку трыжухнікаў падначаліць вытворчы ўздым рабочай масы, накіраваць яго па належным шляху.

Гаспадарчы разьлік яшчэ і да гэтага часу не ўкарэнены ва ўсе зьвены ні работы нашых прадпрыемстваў, агрэгатаў, брыгад і цэхаў. Абязьлічка балоча працягвае біць па заводах і фабрыках БССР. Ураўнілаўка набывае сырокія правы грамадзянства, нагляднаюцца факты калі кваліфікаваны рабочы атрымлівае аднолькавую зарплату з чорнарабочым, за простой часамі атрымлівае больш, чым за адпаведны час работы.

Да такіх прадпрыемстваў адносяцца аднолькавыя фабрыкі «Пралетарская Перамога», «Чырвоная Бярэзіна» і Менская цукерная фабрыка «Камунарка».

«Пралетарская Перамога» за першую дэкаду ліпеня свой прамфінплян выканала ўсяго на 67,7 проц. і «Чырвоная Бярэзіна» на 69,4 проц. Другая дэкада ліпеня дае яшчэ горшыя вынікі выкананьня пляну. Так, па «Чырвонай Бярэзіне» плян выкананы на 63 проц., а «Пралетарская Перамога» дала толькі 56 проц. выкананьня пляну.

Горш за ўсё абстаіць справа з выкананьнем прамфінпляну на фабрыцы «Камунарка». «Камунарка» ужо 2 месяцы як уступіла ў лік 518, яна мэханізавана на апошнім слове навейшай тэхнікі, вытворчая магутнасьць фабрыкі вялізарнейшая, фабрыка сёлета ліквідавала ўвесь гатовай прадукцыі больш як на 24 млн. руб. Але гэты гігант харчовай прамысловасьці не апраўдвае тых задач, якія ўскладзены на яго партыяй і ўрадам. Фабрыка знаходзіцца ў ганебным прарыве. Кіраўніцтва фабрыкай «Камунарка» ня здолела мабілізаваць вялікі ўздым і актыўнасьць рабочых мас вакол тых задач, якія былі пастаўлены прадзыром партыі тав. Сталіным на нарадзе гаспадарнікаў. Прамфінплян фабрыкай за першае паўгодзьдзе трэцяга рашаючага году выканан толькі на 67,4 проц. На фабрыцы «Камунарка» вытворчая праграма зьяўляецца ўпаўне рэальнай і ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што на фабрыцы ёсьць усе ўмовы для бязупынкага яе ажыцьцяўленьня.

У чым-жа справа? Што перашкаджае «Камунарцы» у выкананьні прамфінпляну. Асноўныя прычыны хаваюць на ў тым, што на фабрыцы панурае ўраўнілаўка, абязьлічка, плятуства, рвацтва. На «Камунарцы» адсутнічае сьцісла-барніцтва, ударніцтва адзінаначальне, гаспадарчы разьлік, ахова працы. Рабочыя не знаёмы з тэхнічнымі ведамі, культурнае працэсыцтва.

Усе месяц як на фабрыцы заключаны дагаворы паміж цэхамі і брыгадамі аб пераходзе на гаспадарчы разьлік, але гэтыя мерапрыемствы і да гэтага часу ў жыцьцё не праведзены.

Прагулы набылі масавы характар. Прагульваюць ня толькі пасобныя рабочыя, але прагульваюць і цэлыя брыгады (брыгада Альперовіча).

Палітыка - выхаваўчая работа на фабрыцы пастаўлена зусім дрэнна. І зусім нявышкалёвана, калі маюць месца апартуністычныя выступленьні нават і з боку членаў партыі супроць перагляду нормы і расцэнак (Шылер і Карапачакідзе).

Як-жа абстаіць справа на фабрыцы з вярбоўкай рабочай сілы? «Гавеі звычайна рабочыя самі ішлі на заводы, на фабрыкі, быў... нейкі самацёк у гэтай справе» (Сталін). Зараз фабрыка адчувае вялікую патрэбу ў рабочых, вярбоўкай-жа і замацаваньнем рабочых за фабрыкай ніхто не займаецца. Трыкутнік у гэтым напрамку наклаўся на поўны самацёк.

Гэта ўсё гаворыць за тое, што трыкутнікі прадпрыемстваў БССР і ў прыватнасьці трыкутнік фабрыкі «Камунарка» ня прынялі рашучых мер да таго, каб на аснове паказаньняў правадыра партыі тав. Сталіна, у новых умовах па-новаму, па бальшавіцку перабудаваць сваю работу.

Задачы, пастаўленыя тав. Сталіным, павінны неадкладна ператварыцца ў баявую штодзённую аперацыйную праграму дзеяньняў нашых прадпрыемстваў. Гэта павінны з усёй рашучасьцю правадзіць у жыцьцё ўсе трыкутнікі нашых прадпрыемстваў.

Рабочая кл[illegible] СССР разам з усімі працоўнымі Саюзу, пад кіраўніцтвам КП[illegible] месяцы[illegible] 12,2 пр[illegible] вымі і «левымі» [illegible] наступ[illegible] і прымі рашчым да і[illegible] прамф[illegible] рашаючым годзе прыдзе да 25 проц., мы[illegible], завяршыць пабудову [illegible] карамельны [illegible] адзіны[illegible] стычнай эканом[illegible]нам у хвасы[illegible] цэх. [illegible] продна-гаспадарчы плян [illegible] прамфі[illegible]чы, ён будзе ня толькі вык[illegible] ліквід[illegible] і перавыкананы.

Баявыя выступленьні працоўных Заходняй Беларусі пад лёзунгамі абароны СССР

Карныя экспэдыцыі на Зах. Беларусі

Азьвярэлая фашысцкая банда агнём і мячом спусташае вёскі

Працоўныя даюць узброены адпор

ВІЛЬНЯ, 8-VIII. 1—2-га жніўня працоўныя Заходняй Беларусі наладзілі шмат дэманстрацый пад лёзунгам «рукі прэч ад СССР», вайну імпэрыялістычную ператворым у грамадзянскую». У Карэліцкай гміне некалькі тысяч сялян з чырвонымі сьцягамі і рэвалюцыйнымі лёзунгамі 2 жніўня наладзілі баявую дэманстрацыю супроць новых імпэрыялістычных войн, у абарону СССР.

Атрад паліцыі спрабаваў разагнаць дэманстрантаў, але дэманстранты далі рашучы збройны адпор. Паліцыя прымушана была ўцячы. Улады зьвярнуліся да аднаго з бліжэй стаячых палкоў уланаў (кавалерыі). Уланы,—пераапранутыя рабочыя і сяляне ў вайсковую форму, катэгарычна адмовіліся расстрэльваць сваіх братоў. Больш таго частка улан перайшла на бок дэманстрантаў.

Вайсковае камандваньне выбрала мацерых дзяржаморд-фашыстаў, пераважна—«завадовых» (салдат унтэр-афіцэраў, якія служаць звыштэрмінова). Апрача таго былі мабілізаваны асаднікі і вядомыя фашысты з мясцовай шляхты.

Карны атрад напаў на вёскі Запольле, Карэлічы і інш. Прыгнечаныя сяляне далі рашучы збройны адпор. Падасьпеўшыя сьвежыя сілы зусім спалілі тры вёскі, у тым ліку Запольле.

У выніку заўзятай, упартай бойкі паміж карнікамі і працоўнымі сялянамі Заходняй Беларусі ёсьць шмат забітых і сотні параненых.

Карнікі самым зьверскім чынам распраўляліся ня толькі з мужчынамі, але і з жанчынамі і нават дзецьмі. Банда карнікаў падпаліла вёскі, пры чым абстрэльвала сялян з тым, каб ня даць нічога выратаваць з маёмасьці. Даклад ных вестак няма колькі загінула ў агні ў час пажару і абстрэлу вёсак фашыцкімі бандамі.

Паліцыя і карныя атрады ўчыняюць шматлікія арышты, арыштавана 170 чал. Арышты працягваюцца. Так расправіўся фашыцкі ўрад Польшчы над працоўнымі сялянамі Заходняй Беларусі, якія вышлі дэманстраваць супроць вайны, ў абарону СССР.

Польская буржуазія зайшла ў тупік. Гаспадарчы развал з кожным днём паглыбляецца з катастрафічнай хуткасьцю. Буржуазія бачыць адзіны выхад —большы націск на рабочую клясу, фізычнае зьніштажэньне авангарду пралетарыяту—камуністычнай партыі і збройны напад на СССР.

Рабочыя і сяляне з кожным днём усё больш рашуча становяцца на шлях рэвалюцыйнага выхаду з крызісу. Рабочыя і сяляне на справе пераканаліся, што толькі дыктатура пралетарыяту, толькі Савецкая Ўлада ў Польшчы дасьць сапраўдны выхад з голаду, беспрацоўя і вайны, вырве мільёны з капцюроў фашыцкага тэрору.

Ня стрымаць фашыцкаму ўраду карнымі экспэдыцыямі, расстрэламі дэманстрантаў, фізычным зьніштажэньнем палітзьняволеных, узьнімаючайся грозная хвалі пралетарскай рэвалюцыі.

(Ул. інф.).

ЗЬДЗЕКІ І КРЫВАВЫЯ КАТАВАНЬНІ ПА ЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ УРАДОМСКАЙ ТУРМЕ

БЭРЛІН. 5-8. Палітзьняволеныя Радомскай турмы (Польшча) у адказ на пазбаўленьне іх асьвятленьня па вечарох заявілі калектыўны пратэст.

У адказ на гэта 30 дазорцаў на чале з нам. начальніка і старшым дазорцам узарваліся ў камару ўночы, калі зьняволеныя спалі, сьцягнулі іх за ногі з ложкаў. А выцягнуўшы ў калідор люта зьбівалі іх жалезнымі кіямі, прымушаючы праходзіць «праз строй».

Зьняволеных білі да страты прытомнасьці. 8 палітзьняволеных былі кінуты ў карцар напоўнены вадой, у аднэй бялізьне, дзе іх пратрымалі 24 гадзіны. На працягу ўсяго гэтага часу зьняволеныя галадалі.

Прыбыўшы на наступны дзень пракурор заявіў зьняволеным, што іх чакае прыгавар да [illegible] 3-х гадовага зьняволеньня, [illegible] турмовага рэжыму.

Масавае звальненьне рабочых і служачых і скарачэньне зарплаты

ВАРШАВА. 8-8. Спробы варшаўскага гарадзкога самакіраўніцтва зьмякчыць фінансавы крызіс без правядзеньня масавых звальненьняў рабочых і служачых і скарачэньня зарплаты далі пітхіх вынікаў.

Пастаноўлена, што проект скарачэньня колькасьці рабочых і служачых, ня гледзячы на яго палітычную небясьпеку, павінен быць ажыцьцёўлены, бо другога выхаду няма. Бюджэт Варшавы павінен быць зьменшан на 20 мільёнаў злотых.

Міністэрства ўнутраных спраў зьвярнулася з лістом да кіраўніцтва. Варшавы, у якім прапануе неадкладна прыступіць да скарачэньня бюджэту і да зьмяншэньня пэнсіі з 1 верасьня на 15 проц. Такім чынам, 1 верасьня адбудуцца масавыя звальненьні рабочых і скарачэньне зарплаты.

Катаржны прысуд над матросамі ў Францыі

ПАРЫЖ, 6-VIII. Апошні дзень працэсу ў вайскова-морскім судзе ў Тулёне над маракамі, якія абвінавачваюцца ў бунце ў дысцыплінарных ротах, адзначаўся новымі рэзкімі інцыдэнтамі. Сьведкі абароны—прадстаўнік МОПР'у і камсамолец былы марак, былі выведзены з залі суда. Пасьля прамоў абаронцаў т. т. Садулі і Джырары быў вынесены прыгавор: двое прысуджаны да 5 год арыштанскіх рот, адзін да 3 год, чацьвёра—да 30 месяцаў, і двое да 2-х год турмы.

Уся прэса характарызуе прыгавор, як вельмі жорсткі. «Юманітэ» адзначае рост сымпатыі да падсудных з боку вайсковых матросаў. 22 матросы ўступіла ў камсамол.

Расстрэл мітынгу бастуючых рабочых у Пэру

НЬЮ-ЁРК, 5-VIII. Орган Уругвайскай кампартыі «Жусьцісія» паведамляе аб масавых расстрэлах бастуючых рабочых у Пэру, карнымі экспэдыцыямі, якія ўзброены кулямётамі і вайсковымі аэраплянамі. У Пэру ў сучасны момант бастуюць рабочыя нафтапромыслаў. Бастуючыя рабочыя карыстаюцца спачуваньнем і падтрыманьнем сялянскага насельніцтва, якое бясплатна забясьпечвае іх харчамі.

Урад убачыўшы, што дзяжурыі гэтай салідарнасьці, рабочыя здолеюць пратрымацца доўгі час, абвясьціў стан аблогі. Пасланае войска абкружыла мітынг рабочых, якія спрабавалі абараняцца кіямі і каменьнямі. Войска адкрыла агонь. Паводле няпоўных вестак, колькасьць забітых рабочых даходзіць да 300.

З малатка...

Мал. М. АСОТА.

Замест фэльетону

Ліцытацыя.

Матка боска раз...
Матка боска два...
Матка боска налончона з езусам...

Ну хто, нарывайся, зусім таннa, за 10 злотых і астрабрамскую і чанстахоўскую...

Жадаючых купіць матку боскую палончоную з езусам не знайшлося і сэквэстратар (чыноўнік які канфіскуе і прадае з малатка рэчы за падаткі) прымушан быў адкінуць яе ў хлам.

Нехаця апускалася матка боска. Тут крыкалі, як піша «Газэта Варшаўска» —«рэчы ахвяр ліцытацыі, якія пераважна былі ўласнасьцю беднаты, абчым яскрава сьведчылі нікчэмныя прадметы ліцытацыі, як старыя эпошныя, нават нядзетныя да ўжытку мэблі, стара рая культавая з вывернутымі наверх унутранасьцямі канапа, гарнчок, на душка, чапяла, матальня, падраная коўдра і іншае барахло...».

«Газэта Варшаўска», орган эндэкаў, гэтых заядлых людажэраў рабочай клясы, ўдае што яна «абараняе» беднату. Чаму пусьціла кракадзільлі сьлёзы «Газэта Варшаўска» зусім зразумела. Фашыцкі ўрад перагнуў палку, ён за падаткі пачаў забіраць ня толькі апошнія манаткі, але і нават старыя абразы. І іменна абразоў шкадуюць эндэкі, і іменна па абразох праліваюць яны кракадзільлі сьлёзы. З продажам маткі боскай з малатка буржуазія чуе як гарыць грунт, хіснецца ўстоі рэлігіі, апоры буржуазнай улады.

Божны дзень па мястэчках, па гарадох сэквэстратар крычыць: раз, два, —хто больш?..

І вось ліха, няма ахвотнікаў, ніхто ня купляе рэчаў.—Сэкрат вельмі просты. Сёньня купі, а заўтра ў цябе забяруць за падаткі.

Так і з беднай маткай боскай чэнста хоўскай палончонай з езусам хрыстусам. Ніхто яе ня купіў, а яна мела ўжо добры стаж. «Газэта Варшаўска», піша што гэтая матка боска на працягу 30 год служыла культам у сямі селяніна!!! а цяпер навідравала разам з гарнкамі, падушкай, старым сталом, цягаецца па рынках, валяецца па падвалах.

І нічога, адчувае сябе ня дрэнна. Праўда, можа яна бывае часамі і пакрыўджана, але на гэта не зварочвае ўвагі ні папа рымскі, ні варшаўская мама. Мы таксама не пратэстуем і не заступаемся. Нехай сабе і далей валяндаецца, хай валочацца чанстахоўскія, астрабрамскія па сутарэньнях, па рынках...

Але адкінем боскую матку. Не аб ёй ідзе гутарка. Фашыцкі ўрад Польшчы за падаткі абдзірае, руйнуе гаспадарку, апошнія рэчы селяніна і рабочага прадаюцца з ліцытацыі—з малатка. Па падаткі ў вёску прыяжджаюць цэлыя атрады паліцыі. Падаткі спаганяюць пры дапамозе карных экспэдыцый. І ўсе сродкі вырваныя ў працоўных мас фашыцкі ўрад траце на падрыхтоўку збройнага нападу на СССР.

Ніводным словам не запратэставалі рабочыя і сяляне супроць продажы маткі боскай з малатка. Наадварот, забірайце, кажуць, гэтае непатрэбнае барахло, прынамсі ня будзе ў хаце павуцінне і пылу.

Але рабочыя і сяляне выступаюць, адбіраюць свае патрэбныя рэчы з рук паліцыі і сэквэстратара, вядуць сапраўдную бойку з паліцыяй сахорамі, сякерамі, чапялой, усім што засталося ад ліцытацыі адбіваюцца, абараняюцца ад сэквэстратара,—буржуазнай дыктатуры, якая рабуе іх апошнюю маёмасьць.

Рабочыя і сяляне выступаюць актыўна і клянуцца выступіць у любую хвіліну са зброяю ў руках на абарону Савецкага Саюзу. А матка боска нехай сабе... валяндаецца...

Я. Пралеска.

ТУРЭМНЫМ ТЭРОРАМ---СЫСТЭМАЙ ПАВОЛЬНЫХ ЗАБОЙСТВАЎ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ

—польскі фашызм расчышчае тыл да ўзброенага нападу на СССР

Адозва ЦК кампартыі Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі да працоўных усяго сьвету

БЭРЛІН. 31-7. У сувязі з распараджэньнем ўраду Пілсудзкага прыраўняць палітзьняволеных да крымінальных, Цэнтральны камітэт кампартыі Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі выпусьцілі адозву да працоўных усяго сьвету.

«Польскі ўрад, гаворыцца ў адозьве, — сьвята захоўваючы царскія законы пазбавіў палітзьняволеных нават такіх нязначных правоў, якія ім даваў царскі ўрад. У Польшчы караюць катаргай ня толькі за камуністычныя пераконаньні.

Тысячы беспратыйных рабочых і сялян чакае такі-ж лёс, як і камуністаў, за самыя нязначныя спробы супраціўленьня зьверскаму рэжыму фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага за спробу абараніць свой кавалак хлеба, сваё жыцьцё і сваю чалавечую годнасьць, ад гвалтаў фашысцкай улады. Польшча зьяўляецца турмой народаў. 40 проц. насельніцтва складаецца з народаў гвалтоўна далучаных да Польшчы. Іх палітычныя дзеячы, якія вядуць барацьбу за свабоду гэтых народаў падзяляюць лёс рэвалюцыйных рабочых і сялян».

Адозва прыводзіць вядомыя факты жахлівых катаваньняў—уліваньня мачы ў нос, зьбіваньня жалезнымі кіямі, гвалтаваньне жанчын і г. д.

«Няроўная барацьба, якая вядзецца ў радзе (польскіх турмаў, барацьба зьняволеных з іх катамі, цягне за сабой новыя ахвяры. Самае нязначнае праяўленьне пратэсту абвяшчаецца «бунтам», які выклікае за сабой зьбіваньне і катаваньне арыштаваных. Апошняя іх зброя—галадоўка».

Адозва зьмяшчае апісаньне нячуваных па сваім зьверстве фашысцкіх мэтадаў примусовага «штучнага кармленьня».

«Катаваньні і масавыя забойствы,— гаворыцца ў заключэньне,—ужо лютуюць ва ўсіх турмах Польшчы. Толькі рашучы пратэст самых шырокіх працоўных мас усяго сьвету можа стрымаць Пілсудзкага ад крывавай расправы з безабароннымі палонянікамі».

Адозва зварачваецца таксама да рабочых, якія знаходзяцца ў сацыялістычных партыях, далучыцца да пратэсту наперакор сваім палітычным правадыром, якія сьпяшаюцца з «пратэстамі» толькі тады калі гутарка ідзе аб тым, каб рука ў руку з усёй міжнароднай буржуазіяй ачарніць Савецкі саюз. Адозва зварочваецца таксама да дзеячоў літаратуры, мастацтва і навукі з заклікам не пакрываць сваім маўчаньнем крывавых злачынстваў польскага фашызму. (ТАСС).

Сельсаветы яшчэ не павярнуліся тварам да жывёлагадоўлі

Магілеўскі, Барысаўскі, Менскі, Дубровенскі і Сіроцінскі раёны зрываюць пляны будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў

Парт'ячэйкі, сельсаветы, канкрэтным кіраўніцтвам ходам будаўніцтва забясьпечце поўнае выкананьне будаўнічых плянаў у вызначаныя тэрміны

Лікідаваць прарывы ў будаўніцтве кароўнікаў і сьвінарнікаў

Магілеў. (Наш. кар.). Магілеўскі раён мае жывёлагадоўчы напрамак. Адгэтуль зусім зразумела роля партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый у галіне вырашэньня гэтай важнейшай задачы. Між тым факты гавораць аб тым, што рад раённых арганізацый, сельсаветаў і праўленьняў калгасаў праяўляюць псўную бязьдзейнасьць у ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі і ўраду па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Так, будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў у калгасах раёну пад пагрозай зрыву.

Недаацэнка важнасьці своячасовага будаўніцтва, адсутнасьць мабілізацыі мас, апартуністычная стаўка на самацёк—вось прычыны таго, што калгасы «Саха і Молат», «Перамога», «Адраджэньне», «Непераможны», «Чырвонаармеец», імя Будзённага не прыступілі да гэтага часу да будаўніцтва кароўнікаў і рад з іх нават не загатовілі яшчэ будаўнічага матэрыялу.

Асобныя калгасы, як «Чырвоны Сьвабоднік» і інш. Дашкаўскага сельсавету, імкнуцца сваю бязьдзейнасьць апраўдаць недахватам рабочай сілы, у той час як зьдзельшчына ў калгасах уведзена фармальна, а па радзе галін работ яна зусім ня ўжываецца, рабочая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна.

У тых калгасах, дзе будаўніцтва распачата, яно праходзіць зусім незадавальняюча. Напрыклад, у калгасе «Новы мір», Княжыцкага сельсавету, будаўніцтва кароўніка выканана на 15 проц., а па пляну будаўніцтва павінна быць скончана да 1 кастрычніка. Ня лепшае становішча мы маем і ў калгасе імя Дзяржынскага, дзе будаўніцтва кароўніка на 200 галоў выканана ўсяго на 30 проц. Зараз будаўніцтва зусім спынена з-за адсутнасьці будлесаматэрыялаў. Загатоўка і вывазка будматэрыялаў не праводзіцца.

Яшчэ горш стаіць справа з будаўніцтвам сьвінарнікаў. У раёне патрэбна будаваць 17 новых сьвінарнікаў. Але калі паглядзець тэмпы будаўніцтва, дык можна сказаць, што сьвінарнікі ня будуць пабудаваны. Напрыклад, да гэтага часу калгас «Камінтэрн» плян будаўніцтва сьвінарнікаў выканаў усяго на 35 проц. «Чырвоны Партызан» на 60 проц., «Чырвоны Фронт» на 35 проц., імя «16 зьезду УсесКП(б)»—на 25 проц.

Побач з гэтым ёсьць і такія калгасы, як «Чырвоны Сьцяг», «Чырвоная Зорка», якія будаўніцтва выканалі на 90 проц. Гэта з усёй яскравасьцю сьведчыць, што тыя праўленьні калгасаў, якія па баявому прыступілі да выкананьня важнейшай задач, здолелі мабілізаваць на гэтую справу калгасныя масы, пасьпяхова спраўляюцца з будаўніцтвам сьвінарнікаў.

Значная недаацэнка будаўніцтва працягваецца далей ня можа. Магілеўскі раён павінен ліквідаваць гэтую гаганебную бязьдзейнасьць у будаўніцтве кароўнікаў і сьвінарнікаў. Раённы камітэт партыі павінен рашуча ўдарыць па канкрэтных зрыўшчыкаў будаўніцтва. Трэба прымусіць праўленьні калгасаў і сельсаветы пераключыцца за баявое правядзеньне будаўніцтва, мабілізаваць калгасныя масы і шляхам шырокага разгортваньня спаборніцтва і ўдарніцтва, увядзеньня на будаўніцтве зьдзельшчыны, ліквідаваць прарывы і выканаць у вызначаны тэрмін баявое заданьне партыі і ўраду.

Ал. Нёманскі.

Райкалгассаюз будаўніцтвам ня кіруе

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Тэмпы будаўніцтва ў калгасах настолькі марудныя, што яны павінны прыкаваць увагу раённых арганізацый сельсаветаў і вяковых партыйных ячэек.

Па Барысаўскім раёне намечана сёлета пабудаваць і прыстасаваць 44 сьвінарнікі на 2.895 галоў; кароўнікаў трэба пабудаваць і прыстасаваць—16 на 1.300 галоў. Фактычна пачалося будаўніцтва 3-х сьвінарнікаў і праводзіцца работа на прыстасаваньні 12. Кароўнікаў будуецца два, чатыры прыстасавана.

Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб пагрозе зрыву плянаў будаўніцтва ў калгасах. Ня гледзячы на гэта Райкалгассаюз ня ўжыў ніякіх захадаў каб паслідіць тэмпы будаўніцтва.

Будаўніцтва ў калгасах адказьнейшы вучастак работы. Трэба мабілізаваць усе магчымасьці каб выканаць пляны будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў. Сельсаветы павінны аказыва дапамагаць у разгортваньні будаўніцтва па калгасах.

С.

Сельсаветы не дапамагаюць будаўніцтву ў калгасах

Сіроцінскі раён ганебна адстае па выкананьні плянаў будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў у калгасах. Райкалгассаюз мала цікавіцца гэтым пытаньнем. Таксама ня цікавяцца будаўніцтвам і сельсаветы. Старшыня Мішневіцкага сельсавету Жукаў на нарадзе старшынь калгасаў нават забараніў ставіць пытаньне аб становішчы будаўніцтва. Між тым па гэтым сельсавеце плян будаўніцтва на 1-га ліпеня быў выкананы ўсяго на 10 проц.

П.

Будаўніцтва зрываецца

Па калгасах Менскага раёну зрываецца плян будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў. У калгасе «Бальшавік» і імя Сталіна, Прыгарадняга сельсавету, «Чырвоны Барацьбіт», Старчэцкага сельсавету, «Прагрэс», Паперынскага с-с—будаўніцтва кароўнікаў разгортваецца вельмі марудна.

К.

Аб чым думае Дубровенскі райкалгассаюз

Выкананьне пляну будаўніцтва вельмі мала хвалюе Дубровенскі Райкалгассаюз. Прыбыўшыя ў яго адрас цьвікі і вашу Райкалгассаюз накіраваў назад на базу, ня гледзячы на тое, што праграма будаўніцтва па калгасах і раёнах досыць значная.

Будаўнічыя брыгады па калгасах ня створаны, лесаматэрялы не загатоўлены, сельсаветы не заслухоўваюць кіраўніцтва калгасаў аб ходзе будаўніцтва і вічым ім не дапамагаюць.

Неабходна зараз-жа дабіцца пералому ў будаўніцтве сьвінарнікаў і кароўнікаў.

Б.

Галавацяпства ці шкодніцтва?

У калгасе «Пабудка» (в. Уборкі), Асіпавіцкага раёну, пачалі будаваць у мінулым годзе сьвінарнік на 96 сьвіноматак, які і да гэтага часу ня скончаны больш як на 50 проц. Пабудаваная частка сьвінарніку, праведзеная арцельлю Асіпавіцкага Райкалгассаюзу пад кіраўніцтвам тэхніка Шырокага, нічога ня варта. Зараз прыходзіцца перабудоўваць усё нанова, што будзе каштаваць да 1.000 руб. Сьцены пабудаванага сьвінарніку так зрабілены, што хістаюцца ад ветра. Таксама зусім спартачылі страху: зроблена страха з гонтаў, але латы дрэнна дагледжаны да крокваў, у выніку чаго страху можа лёгка зьнесьці пры навальніцы.

Для скончаньня сьвінарнікаў неабходна сартовае жалеза і цьвікі. Гэтых матар'ялаў Асіпавіцкі Райкалгассаюз не адпускае.

У самым калгасе таксама наглядаецца безгаспадарчасьць. Бочку цэменту сапсавалі, замачыўшы яе вадой, бочкі сталі смалой ляжаць цэлае лета на сонцы, смала з іх выцякае.

Справай будаўніцтва сьвінарніку ў калгасе «Пабудка» павінны зацікавіцца органы пракуратуры і РайКК РСІ.

А. Гарэлкі.

150 сьвіней застаюцца зімаваць пад адкрытым небам

Сьвінагадоўчая таварная фэрма «Чырвоны Будаўнік», Камарынскага раёну, мае статак са 150 сьвіней, у тым ліку 60 сьвіноматак. Укамплектаваньне працягваецца. Да канца 1931 году ў калгасе павінна быць каля 500 галоў. Між тым, справа з будаўніцтвам сьвінарнікаў у фэрме абстаіць вельмі дрэнна. Да гэтага часу будаўніцтва не пачата з прычыны адсутнасьці рабочай сілы.

Райкалгассаюз ня кіруе справай будаўніцтва. Цесьляроў, якія навучаюцца на курсах будаўнікоў, ён чамусьці паслаў будаваць сьвінарнік у калгасе імя Карла Маркса, які мае ўсяго да 20 галоў сьвіней.

Свой.

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГЕЙ

прывітаў чырвона-абозных здатчыкаў збожжа Чэрвеншчыны

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

ЧЭРВЕНЬ. Уборка азіміны скончана. Раён пачаў збожжазагатоўкі.

Учора калгас „Кастрычнік", „Чырвоны Партызан", імя Леніна, імя Чарвякова, „Чырвоны Шлях" і „Перадавік" першымі арганізавалі чырвоны абоз са збожжам. Яны здалі 250 цэнт. збожжа.

У г. Чэрвені пры сустрэчы чырвонага абозу адбыўся мітынг, на якім выступіў генэральны сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гэй.

Калгасьнік калгасу імя Леніна тав. Раманчык, выступаючы на мітынгу ад імя калгасьнікаў--удзельнікаў чырвонага абозу, у адказ на прамову тав. Гея запэўніў партыю і ўрад, што задачы, якія стаяць перад калгасамі Чэрвеншчыны ў сувязі з уборкай ураджаю, збожжазагатоўкамі і асеньняй сяўбой, будуць выкананы і перавыкананы на аснове сацыялістычных мэтадаў працы—ударніцтва і спаборніцтва.

Гэта будзе руйнуючым ударам па кулаку і яго агентуры—правых і „левых" апартуністых.

Аб ходзе перабудовы спажывецкай каапэрацыі

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 6-га жніўня 1931 году

Заслухаўшы паведамленьне тав. Хаскіна аб ходзе перабудовы спажывецкай каапэрацыі, бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што работа па перабудове спажывецкай каапэрацыі яшчэ далёка ня скончана. Асабліва нездавальняюча пра ходзіць разгортваньне раздробнага гандлю па аб'яднаньнях і недапушчаль на слаба разгортваецца дадатковая раздробная гандлёвая сетка.

У дадатак да пастановы бюро ЦК КП(б)Б ад 16 ліпеня 1931 году прапанаваць правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. На працягу жніўня месяца пашырыць гандлёвую сетку па горадох БССР на 267 адзінак, з іх: па Менску —70, Гомлі—45, Віцебску—45; Магілёве —25; Воршы—15; Полацку—10, Мазыры—5, Бабруйску—25, Барысаве—5 з тым, каб гандлёва-галінныя раздробныя аб'яднаньні БКС дадаткова пашырылі сваю сетку на 105 адзінак, ЦРК і ЗРК—па 105, астатнюю колькасьць у гарадох Рэчыца, Добруш, Жлобін і інш. рабочых пунктах.

ЦК абавязвае прэзыдыум Белкаапсаюзу разгортваньне гандлёвай сеткі праводзіць па лініі максымальнага пашырэньня прадуктовай і гароднінай сеткі з большым набліжэньнем яе да фабрык, заводаў і рабочых акраін і адмовіцца ад канцэнтрацыі яе толькі ў цэнтры гораду, а стварацъ гандлёвую сетку ў рабочых пунктах, надалёка ад прамысловых прадпрыемстваў.

2. Зацьвердзіць пабудову на працягу жніўня 14 новых магазынаў па БССР. Згадзіцца з прапановай прэзыдыуму Белкаапсаюзу, што гэтыя 14 магазынаў, якія будуюцца,—павінны быць прадуктовымі і ў рабочых раёнах.

3. Прыняць да ведама паведамленьне тав. Хаскіна, што на рамонт і будаўніцтва гандлёвай сеткі Цэнтрасаюзам пераведзена 500.000 руб. Улічваючы абсалютную недастатковасьць гэтай сумы, прасіць прэзыдыум Цэнтрасаюзу павялічыць асыгнаваньні як на рамонт, так і на пашырэньне крамнай сеткі па БССР яшчэ на 500.000 рублёў.

4. Лічыць неабходным неадкладна разгарнуць работу па арганізацыі савецкіх рынкаў, асабліва ў буйных гарадзкіх цэнтрах. Для гэтай мэты абавязаць Белкаапсаюз і Наркамснаб неадкладна скласьці плян разгортваньня і арганізацыі савецкіх рынкаў з тым, каб прыстасаваньне памяшканьняў, якія ёсьць на раней існаваўшых рынках, і будаўніцтва новай ларковай сеткі на гэтых рынках было-б скончана на працягу жніўня і верасьня месяцаў.

5. Усклясьці поўную адказнасьць за неадкладную перадачу гандлёвай сеткі, адвод неабходных вучасткаў для будаўніцтва новай гандлёвай сеткі, а таксама адвод вучасткаў для арганізацыі савецкіх рынкаў—на старшынь гарсаветаў і сакратароў гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі.

6. Даручыць тав. Бэнэку пры канчатковым устанаўленьні аб'ектаў ударнага будаўніцтва забясьпечыць неабходнымі матар'ялямі пабудову 14 крам і рамонт сетк., якая існуе і пашыраецца.

7. Лічыць абавязковым — перавод магазынаў з месячным зваротам у 100.000 руб. — на поўны гаспадарчы разрахунак з самастойным кантакарэнтным рахункам у Дзяржбанку, даўшы права загадчыкам гэтых магазынаў самастойнай закупкі тавараў. Прэзыдыум БКС неадкладна прыступіць да ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы.

Даручыць БКС праўрацаваць пытань не адносна пераходу на гаспадарчы разрахунак гандлёвых прадпрыемстваў з меншым зваротам.

8. Прызнаючы, што адным з тормазаў у разгортваньні раздробнай гандлёвай дзейнасьці рэспубліканскіх аб'яднаньняў БКС зьявілася застаўленьне за ім гуртовай гандлёвай работы, прапанаваць Прэзыдыуму Белкаапсаюзу ў 2-дэкадны тэрмін вызваліць рэспубліканскія аб'яднаньні па раздробным гандлі ад гуртовай работы, стварыўшы з самастойныя рэспубліканскія гуртовыя гандлёвыя аб'яднаньні: гурткоўвае аб'яднаньне па прамтаварах, аб'яднань не па прадтаварах і аб'яднаньне па гаспадарчых таварах. Таксама лічыць мэтазгодным падзел аб'яднаньняў Белкааплодагароднінны на 2 аб'яднаньні: аб'яднаньне па раздробным гандлі плодагароднінай і аб'яднаньне па загатоўках і збыце.

Для лепшага кіраўніцтва загатоўкамі мяса, скурсырцу, конволасу, шчацінны і г. д. прыняць прапанову прэзыдыуму Белкаапсаюзу аб стварэньні галіннага рэспубліканскага аб'яднаньня па жывысырцы.

9. У мэтах лепшага кіраўніцтва арганізацыйна-гаспадарчай работай ЗРК лічыць мэтазгодным стварэньне ўнутры БКС інструктарскай групы па кіраўніцтве ЗРК. Прэзыдыуму БКС у дэкадны тэрмін гэткую групу стварыць, устанавіўшы неабходны інструктаж і жывое кіраўніцтва ЗРК. Прапанаваць тав. Хаскіну ўнесьці канкрэтную прапанову па пытаньні далейшага пашырэньня ЗРК.

10. З прычыны таго, што практыка каапэрацыйных арганізацый у разьмеркавальні пайкоў прывяла да таго, што спажывец ператварыўся ў дробнага гуртавіка (выдача пайка адзін раз у месяц), лічыць неабходным неадкладна скасаваць гэту практыку выдачы пайка і ўвесьці такую сыстэму продажу нармавых прадуктаў, пры якой рабочы спажывец у любы час на працягу месяца мог-бы купляць у любой колькасьці неабходныя яму прадукты ў адпаведнасьці з устаноўленымі нормамі. Абавязаць БКС і Наркамснаб у дэкадны тэрмін распрацаваць новую сыстэму выдачы нармаваных прадуктаў, з тым, каб было абавязкова гарантавана поўнае забясьпечаньне за рабочым-спажыўцом колькасьці нармаваных прадуктаў якія яму належаць.

11. Прызнаць, што новая сыстэма аплаты працы работнікам прылаўка ня ўсюды праведзена. Абавязаць ЦП саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю і прэзыдыум БКС на працягу двух дэкад увесьці новую сыстэму працы па ўсёй каапэрацыйнай сетцы.

12. Адзначаючы выключнае значэньне, якое набывае зараз зьнішчэньне ўсё яшчэ існуючай чаргі ў крамах і магазынах, антысанітарнае становішча крам і магазынаў, грубых адносін да спажыўца—прапанаваць прэзыдыуму ЦСПСБ, прэзыдыуму БКС і партыйным арганізацыям дамагчыся на працягу месячніка па ліквідацыі чаргі зусім канкрэтных практычных вынікаў. Для гэтай мэты неабходна значна шырэй разгарнуць масава-палітычную работу вакол гэтай задачы, а таксама правесьці некалькі показальных судоў над кіраўнікамі арганізацый, якія дапускаюць у магазынах і крамах чаргу, антысанітарнае становішча і г. д.

Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на рашучае выкараненьне наяўнасьці абыякіх адносін да рабочага спажыўца і яго запатрабаваньняў, што зьяўляецца найбольш трывожным ва ўсёй рабоце спажывецкай каапэрацыі.

13. Адзначыць, што дырэктыва ЦК аб арганізацыі райзагаў у раёнах—мясцовымі і партыйнымі арганізацыямі выконваецца нездавальняюча, толькі ў некаторых раёнах прыступлена да арганізацыі райзагаў, што сьведчыць аб недаацэнцы значэньня дыферэнцыяцыі работы спажывецкай каапэрацыі ў раёне і палепшаньня яе загатоўчай дзейнасьці.

Абавязаць райкомы партыі безагаворачна выканаць дырэктывы ЦК аб стварэньні райзагаў і скончыць іх арганізацыю па ўсіх раёнах на працягу дэкаднага тэрміну.

Лічыць, што работа па ўкамплектаваньні кадраў БКС ня скончана. Прызнаць неабходным перадачу БКС неадкладна 10 кіруючых работнікаў. Сакратарыяту ЦК на працягу 5 дзён правесьці гэту перадачу.

Па віне Капаткевіцкага вучлеспрамгасу зрываецца кампанія па загатоўцы дроў

Капаткевіцкі Вучлеспрамгас зрывае забясьпячэньне цэнтраў дрывамі. Калі ў загадчыка гэтага вучлеспрамгасу запытаеш, чаму правальваецца сплаўная кампанія дроў, ён адказвае: **«На Пліцы, таварыш, страшэнная засуха, сплаў ляць немагчыма, чакаем прыліву».** Такія заяўкі мы чуем ад загадчыка вучлеспрамгасу тады, калі экспартны матар'ял, які многа цяжэйшы за дровы, і зараз вольна праходзіць па рэчцы Пліч. Акрамя, гэтых «вескіх прычын» Капаткевіцкі вучлеспрамгас спасылаецца або на Петрыкаўскі вучлеспрамгас, або на другія якія небудзь «прычыны»: «няма часу», «няхай папрацуе сам брыгадзір» і г. д.

Загатоўка дроў па Капаткевіцкім вучастку праходзіць зусім дрэнна. Загадчык на вучастках працы ніколі ня бывае, таму і ня ведае, што ў яго робяць рабочыя.

Каля сплаўной канавы, асталося 1.500 куб. мтр. дроў. Гэтыя дровы засталіся выключна з прычыны галавацяпскага кіраўніцтва.

Л. Ю.

Напярэдадні навучальнага году

Выканаць дырэктывы ЦК КП(б)Б—

па-баявому падрыхтавацца да навучальнага году

Апартуністы з Плешчаніцкага, Слуцкага і Рагачэўскага раёнаў ставяць пад пагрозу зрыву выкананьне пляну ўсеагульнага навучаньня. Узяць за прыклад баявую работу Клетчанскага сельсавету

Бязьлітасна біць па апартуністах, ігнаруючых дырэктывы партыі і ўраду

Браць прыклад з Клетчанскага сельсавету

Па Клетчанскім сельсавеце (Сіроцінскі р-н) двухдэкаднік трывогі зрабіў значны зрух у справе культбудаўніцтва. Камсамольцы і настаўнікі—ўсе, як адзін, дружна ўзяліся за правядзеньне двухдэкадніка. Ужо арганізавана 4 калгасы з 50 гаспадарак. Да 5-га жніўня былі арганізаваны масавыя суботнікі на дапамогу школе. Калгасьнікі і сяляне вельмі ахвотна наладжваюць суботнікі, выносяць пастановы аб удзеле ўсіх працаздольных у гэтых суботніках. Праводзіцца перавучот дзяцей і дарослага няпісьменнага і малапісьменнага насельніцтва. Наладжваецца перавозка кулацкіх будынкаў пад школы. Калгасьнікі ахвотна складаюць брыгады па перавозцы і пабудове памяшканьняў пад школы.

Калгасы адлічаюць прадукты для школ, а таксама адлічаюць у карысьць народнае асьветы 0,5 проц. валавога прыбытку («Чырвонае Сормава»).

Клетчанскі сельсавет паказаў бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні двухдэкадніка трывогі, увязваючы ўсе гаспадарча-палітычныя кампаніі.

Актыў сельсавету цалкам усю працу падпарадкуе двухдэкадніку, але разам з тым рашуча змагаецца і за калектывізацыю, і за ўборку ўраджаю, і за дарожнае будаўніцтва. Усім іншым сельсаветам БССР трэба ўзяць прыклад з Клетчанскага сельсавету.

Брыгадзір «Сав. Бел.» і НКА: Ю. ІСАКАЎ.

Моцна ўдарыць за ігнараваньне дырэктыў ЦК КП(б)Б

Раённыя арганізацыі Плешчаніцкага раёну пытаньням культурнай рэвалюцыі, правядзеньню двухдэкадніка трывогі на культфронце зусім не надаюць вылучаныя на нарадзе пры райкоме увагі. Грамадзкасьць не мабілізавана. партыі брыгадэіры на зьлёт ні 1-га, ні 4-га жніўня для падагульваньня вынікаў. не зьявіліся.

Калі ўпаўнаважаны НКА і «Сав. Бел.» і райінспэктар дабіваліся пастаўіць пытаньне аб ходзе двухдэкадніка на нарадзе раённага партактыву, дык загадчык культпропу райкому, які, да рэчы, замяшчае сакратара апошняга, **тав. Дварэцкі** катэгарычна адмовіўся нават уключыць у парадак дня нарады гэтае пытаньне. Тав. Дварэцкі пайшоў яшчэ далей,—ён інспэктара нарасьветы мабілізаваў на ўборачную кампанію, зьняўшы, такім чынам, кіраўніка двухдэкадніка.

Ня дзіва пасьля гэтага, калі і РВК да гэтага часу ня выдаў пастановы аб увядзеньні абавязковага ўсеагульнага навучаньня і аб ліквідацыі нпісьменнасьці, калі школы не забясьпечаны памяшканьнямі пад майстэрні, працоўныя пакоі, для арганізацыі гарачых сьнеданьняў, калі ў раёне няма адзінага культпляну, школы не рамантуюцца, будучы занятымі рознымі ўстановамі і прыватнымі асобамі, калі хаты-чытальні не перабудаваліся сваёй работы для лепшага абслугоўваньня калгаснага будаўніцтва.

Так далей працягвацца ня можа. **Трэба моцна ўдарыць па апартуністах, якія ігнаруюць дырэктыву ЦК КП(б)Б па пытаньні падрыхтоўкі да навучальнага году.**

Астрэйка.

Зламаць апартуністычныя настроі

Ня гледзячы на дырэктывы партыйных і савецкіх арганізацый, ня гледзячы на моцны партыйны, прафэсіянальны, камсамольскі і калгасны актыў, **належнага зруху па падрыхтоўцы да новага навучальнага году ў Слуцкім раёне няма.** У раёне будуюцца 11 плянавых школ, павінна быць грунтоўна адрамантавана 22 школы, а астатнія школы патрабуюць дробнага рамонту.

Як-жа абстаіць справа на сёньняшні дзень? **Комсіцкая 2-х камплектавая школа** Пруская сельсавету: зрублены сьцены, устаноўлены кроквы, працавала на гэтай будоўлі 45 чал., а цяпер на будаўніцтве гэтай школы няма ніводнага чалавека з прычыны нявыплаты сельсаветам зарплаты рабочым і дрэннага абслугоўваньня каапэрацыяй рабочых. **У в. Пічураны** Бабаўнянскага сельсавету 2 гады, як вывезена дрэва на школу і толькі 2-3 дні таму назад 4 цесьляры пачалі часаць бярвеньні.

Траяноўская школа Пацэйкаўскага сельсавету будуецца з 1926 г. і зараз яшчэ не атынкована і няма ганкаў. **У Пацэйкаўскім сельсавеце ёсьць 7 школ, з іх адна толькі адрамантавана, а да рамонту астатніх школ не прыступілі, гэткае становішча па ўсім раёне.**

На рамонт школ праведзена самаабкладаньне на 20000 руб. і гэтыя грошы ляжаць не скарыстаныя. **Толькі 24-га ліпеня заключана ўмова інспэктуры з Слуцкім райсампрамгасам на выраб мэблі для школ.** Умова заключана, падпісана, але з славесным агаворкай **т. Біліновіча** (райсампрамгас): **«Мы гэтага заказу ў тэрмін ня выканаем».**

У Рагачэўскім раёне прарыў ня ліквідуецца

Падрыхтоўка да новага навучальнага году па Рагачэўскім раёне злачынна правальваецца. З 14 школ, якія вызначаны для пабудовы, да пачатку навучальнага году будуць скончаны 2-3 Будаўніцтва большасьці школ яшчэ не распачата. Ня лепш справа і з рамонтам школ.

Забясьпечаньне школ настаўнікамі вельмі дрэннае,—на сёньняшні дзень па раёне не хапае 78 настаўнікаў, галоўным чынам, для першага канцэнтру.

Савецкія, партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны мабілізаваць усю грамадзкасьць, самыя шырокія калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б,—новы навучальны год трэба сустрэць падрыхтаванымі.

Я. К.

Апартуністы зрываюць падрыхтоўку да навучальнага году

Па Абчугскім сельсавеце (Крупскі раён) вы ня знойдзеце ніякіх адзнак аб зацікаўленасьці партячэйкі і сельсавету справай культурнай рэвалюцыі, справай правядзеньня другога этапу культэстафэты і двухдэкадніка трывогі па ліквідацыі прарываў у падрыхтоўцы да навучальнага году.

Да гэтага часу ў сельсавеце нават ня быў створаны штаб культэстафэты, зусім ня прыступлена да складаньня адзінага культпляну. Бяз пляну-ж работа даведзена да таго, што сельсавет ня ведае ці ёсьць у яго няпісьменныя, ці ёсьць дзеці школьнага ўзросту, ня ведае сельсавет што ёсьць і што патрэбна для пачатку новага навучальнага году.

Школьныя будынкі яшчэ не падрыхтаваны да заняткаў. Для Абчугскай ШКМ яшчэ ў 1929 годзе вывезены лес, але частка яго ўжо папсавалася, а частку папсавалі няўмелыя рукі, у якія было аддадзена былым Чырвэйскім РВК будаўніцтва гэтай школы. Каля тысячы пнёў гніе і напэўна загніе. Стары школьны будынак не адрамантаваны, мэблі таксама, а ў школьным калідоры тэхнічка школы трымае сьвіньню.

Ня рыхтуецца да навучальнага году і сельспажыўтаварыства. Яно дагэтуль ня мае абсталяванай кніжнай паліцы, ня мае падручнікаў для школ і не клапоціцца аб іх. Сшыткі ляжаць у кроме і разбазарваюцца на ўсе бакі, няма ў сельсавеце і сьледу, які-б сьведчыў аб рабоце сельсавету па забясьпечаньні дзяцей беднаты вопраткай і абуткам. З настаўніцкім складам па Абчугскім сельсавеце дрэнна, як нідзе. Значная частка настаўнікаў выехала ў адпачынак за межы сельсавету і апошні ня ведае ці зьвернуцца яны, ці не. З тымі-ж настаўнікамі, якія засталіся на месцы працаўнікі сельсавету і партячэйкі вядуць дробныя спрэчкі, якія выклікаюць незадаволеньне адных другімі і ствараюць шкодныя настроі ў рабоце. **Сельсавет зусім ня цікавіцца і дадатабытам настаўнікаў, бо пэнсія зьнята выплачана за два, а часткова пасаўтры месяцы.** Ёсьць выпадкі зьніку ў дня настаўнікаў з работы (заводахскага А.) бяз сталай падставы перапылькі таму, што «ходзяць чуткі» зьвесіўць недзе сказаў» і г. д.

Сельсавет, хіму г, Ма й і камсамольскай яч одна сапраўды стаць на ары ячэек будаўніцтва ў Абчугокім ет Асоавіа Трэба па-баявому змагацца ў 7-га, ацяўленьне дырэктыў ЦК К у галіне культурнай рэвалюцыі, ладзіваць масы на разгорнутую ь хтоўку да навучальнага году. В тых-жа ў зрыве пабудовы школ, нараваньні дырэктыў партыі ў галіне матарыяльна-прававога становішча настаўніцтва трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Брыгада «Сав. Бел.» і НКА Плакс, А. Крынічны.

Скончыць школьнае будаўніцтва да новага навучальнага году

Асьвея, 8-VIII. (Белта). Падрыхтоўка да новага навучальнага году ў Асьвейскім раёне праводзіцца дрэнна. Ні адна школа ў раёне не падрыхтавана так, каб без спазьненьня пачаць заняткі. У многіх саўгасах і калгасах няма будынкаў для школ. Распачатае ў 1927-28 годзе будаўніцтва новых школ, дзякуючы марудным тэмпам і апартуністычным адносінам з боку РВК да гэтай справы, ня будзе скончана і ў гэтым годзе. Патрэбным матар'ялам для рамонту і рабочай сілай школы не забясьпечаны. Будынкі Коханавіцкай сямігодкі і цяпер стаяць бяз дахаў. Партыйныя арганізацыі і сельсаветы раёну ў большасьці не зай маліся і не займаюцца гэтым пытаньнем. У рабоце панує самацёк і злачынная бяздзейнасьць.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ЎБОРКІ ЛЁНУ

Раўняцца па калгасу „Расьсьвет", які паказвае бальшавіцкія прыклады барацьбы за лён



Калгас „Расьсьвет" па бальшавіцку змагаецца за лён

ДУБРОЎНА. (Ад нашага спэцкора). Па сустрэчным пляне калгас «Расьсьвет» засеяў замест 55 га 68 га лёну. Праполка праведзена здавальняюча. Ураджай сярэдні. Уборка сьпелых збожжавых культур скончана. 7-га жніўня прыступілі да ўборкі лёну.

Зьдзельшчына ўведзена і дае добрыя вынікі—значнае перавыкананьне норм выпрацоўкі.

Самымі лепшымі ўдарнікамі калгасу зьяўляюцца—Майленкаў Нічыпар, Старавойтаў Янка, Мэханікава Хрысьціна.

Ёсьць і зрыўшчыкі, гультаі—гэта 2 Аўхімы—Асянцаў і Парфененка.

Праўленьне калгасу мяркуе прыняць захады, каб падвозіць дзяцей да ясьляў.

Ня гледзячы на слабае абслугоўвань не машынамі з боку МТС, калгас справіўся з ранейшымі работамі; ён справіцца пасьпяхова таксама і з лёнаўборкай.

МАКАРЭВІЧ.

Прыступілі да ўборкі лёну

Ворша. (Наш кар.). Калгасы Стайкаўскага сельсавету, там, дзе зьдзельшчына на палёх атрымала права грамадзянства ва ўсіх выглядах работ, ужо поўнасьцю скончылі сенаўборку і зараз пасьпяхова праводзяць уборку ўраджаю збожжа.

Калгас імя 1 Мая ўжо пачаў уборку лёну, раньняй сяўбы.

Настрой у калгасьнікаў бадзёры і поўная ўпэўненасьць, што са сваімі задачамі яны пасьпяхова справяцца.

А. К—н.

ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ЛЁНАЎБОРКІ НА 5 жніўня

	ПЛЯН у га	УБРАНА у га
КАЛГАСЫ	107,572	2543 2,4 проц.
САЎГАСЫ		
АДНААСОБНЫ СЭКТАР	131.803	5675 4,3 проц.
Разам	239.375 га	8218 га 3,4 проц.

Аздаравіць кіраўніцтва камуны „Чырвоная Паляна"

Апартуністы зрываюць лёнаўборку

ДУБРОЎНА. (Ад нашага спэцкора). Камуна «ЧЫРВОНАЯ ПАЛЯНА», мае лёна-жывёлагадоўчы напрамак. Аднак, ня гледзячы на гэта, кіраўніцтва камунай праўляе поўную нядбайнасьць да пытаньня лёнаводзтва. Яшчэ да гэтага часу ў камуне ляжыць 3 тоны мятага лёну мінулага году. Толькі зараз камуна прыступіла да апрацоўкі яго.

Сёлета камуна мае 30 га лёну, але поліва яго праведзена дрэнна. Зусім не праведзена падрыхтоўка да ўборкі лёну. На сходзе камунараў, на якім стаяла пытаньне аб падрыхтоўцы да ўборкі лёну палявод Мікалаеў спрабаваў давесьці, што камуна не справіцца з уборкай, лёну, але камунары далі рашучы адпор апартуністу Мікалаеву. Сход пастанавіў правесьці ўборку лёну ўдарнымі тэмпамі.

Для таго, каб папярэдзіць прарыў па ўборцы лёну ў камуне трэба аздаравіць кіруючы склад камуны. Таксама неабходна пасіліць работу Цілевіцкага сельсавету, які нічога ня робіць у справе належнай падрыхтоўкі да ўборкі лёну. На зьлёце камсамольцаў Цілевіцкага сельсавету быў ухвалены рад мерапрыемстваў па правядзеньні ўборкі лёну, але пакуль што практычна нічога ня робіцца.

Трэба таксама аздаравіць мясцовую ячэйку КП(б), якая складаецца амаль выключна з аднэй сям'і Навумавых. Трэба даць рашучы адпор зажыму крытыкі з боку партыйца Навумава. Трэба даць на руках зрыўшчыкам лёнаводзтва ў камуне—Мікалаеву.

М—Ч.

Зьняць пагрозу зрыву будаўніцтва Вушацкай МТС

Пляны будаўніцтва Вушацкай МТС на сёлетні будаўнічы сэзон даволі шырокія. Да восені павінны быць пабудаваны майстэрня, базісны склад, 2 павеці для машын, пажарная пуня і кантора.

З прычыны адсутнасьці патрэбных матар'ялаў, будаўніцтва пачата з вялікім спазьненьнем. Вучлеспрамгас, які павінен даставіць матар'ял, затармазіў гэтую справу, а МТС на гэта зусім не рэагавала.

Адцягнуўшы тэрміны на месяц, МТС урэшце пачынае будаўніцтва. Але, зноў выяўляецца недахват матар'ялаў, недахват рабочай сілы, нічога няварты выканаўца будаўніцтва—тэхнік. Пры такім становішчы будаўніцтва бязумоўна не магло, як сьлед, пасоўвацца наперад.

Адміністрацыя МТС пра вярбоўку рабочай сілы зусім ня думае. Яна задавольваецца толькі той рабочай сілай, якая прышла самацёкам. На сёньняшні дзень для будаўніцтва не хапае 16 муляроў і 16 цесьляроў. У выніку гэтага будаўніцтва некаторых аб'ектаў, як пажарная пуня, пазель для малатарняў і жылы дом, знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Вінуўнік зрыву—кіраўніцтва МТС. Яно мала зварочвала ўвагі на забясьпячэньне будаўніцтва неабходнымі сродкамі. Дырэктар МТС па цэлых месяцох ня бываў на будаўніцтве. Ніколькі не садзейнічалі будаўніцтву райком партыі, РВК і райпрафсавет. Апошні сярод сэзоньнікаў-рабочых ня вёў ніякай работы; а ў гэты час рабочая сіла скарыстоўвалася нерацыянальна, сацспаборніцтва і ўдарніцтва адсутнічала, уся работа праводзілася падзённа.

Будаўнічы сэзон набліжаецца да заканчэньня. Пагрозу зрыву будаўніцтва павінна быць зьнята. Панікёрскім разважаньням—«усё роўна ўжо праваліў будаўніцтва некаторых аб'ектаў»—павінен быць аб'яўлен самы рашучы бой.

Райком КП(б)Б і РВК павінны ўзяць будаўніцтва пад сталы сыстэматычны нагляд кіраўніцтва і кантроль.

Барысёнак Паўла, Карцель Ільля.

О. Канакоцін

Літаратура на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

VIII. Літаратура і іншыя галіны мастацтва

Літаратурныя пытаньні цесна зьвязаны з пытаньнямі барацьбы за пралетарскае мастацтва наогул. Літаратура непарыўна органічна зьвязана з такімі галінамі мастацтва як тэатр, кіно, музыка. Барацьба за пралетарскую літаратуру ёсьць у той-жа час і барацьба за пралетарскі тэатр, кіно. На фронце мастацтва, клясы якія сходзяць з гістарычнай сцэны шалёна су праціўляюцца за захаваньне сваіх пазіцый, яны тут прымаюць асаблівыя прыёмы маскіроўкі варожых вылазак, а іншы раз робяць і адкрытыя вылазкі. Дыскусія аб нашай кінематографіі, у якой выступалі з варожымі ўстаноўкамі Дыла і Зарэцкі, дыскусіі аб шляхох беларускага тэатру (першая аб п'есе «Каля тэрасы», другая аб пастаноўках БДТ 1) у 1927 г. былі ўжо адкрытымі вылазкамі супроць пралетарскага мастацтва за захаваньне нацыянал-дэмакратычных пазыцый у мастацтве. У барацьбе з гэтымі вылазкамі ворага пралетарская літаратура адыграла важную ролю. Яна ня толькі разам з пралетарскай грамадзкасьцю выкрыла і біла ворага, але проціставіла свае пралетарскія творы для тэатру і кінематаграфіі.

У галіне тэатральнага мастацтва праведзена за апошнія гады вялікая барацьба за пралетарскі зьмест гэтага віду мастацтва. Нацыянал-дэмакраты імкнуліся захаваць за сабой тэатр, скарыстаць сцэну для распаўсюджаньня сваіх ідэй праз такія пастаноўкі як «Тутэйшыя», «Апраметная»—В. Шалевіча, «Скарына, сын з Полацку»—М. Грамыкі, «Кастусь Каліноўскі»—Міровіча, «Вір»—Рамановіча, «Каля Тэрасы» і інш. Але на гэтым вучастку яны былі выкрыты і разгромлены.

Пралетарская літаратура дала свае творы тэатру, блізкія пралетарыяту, творы, якія ўнесьлі карэнны пералом у наш тэатр.

«Гута» Кобеца сапраўды зьявілася лепшым прыкладам творчасьці маладога рабочага драматурга. Недарма-ж «Гута» была сустрэта ў штыхі з боку нацыянал-дэмакратаў і нават на «Гуце» зламалі сабе зубы і некаторыя нацыянал-апартуністы. Калі першыя проста адмаўляліся ставіць «Гуту» і ня прызнавалі яе п'есай, дык другія спасылаючыся на слабую сцэнічнасьць, на нявытрыманасьць з фармальна-драматычнага боку імкнуліся абкружыць «Гуту» халадком недавер'я, каб, мякка кажучы, сабатажам узяць «Гуту» ў палон і зацерці. Але пралетарская грамадзкасьць прыняла «Гуту» з натхненьнем. яна дала па руках тым, хто імкнуўся сарваць пастаноўку пралетарскай п'есы. Зараз ужо «прыяцелі» не асьмельваюцца выступаць супроць «Гуты», бо яна прызнана аднэй з лепшых п'ес Савецкага Саюзу і на ўсесаюзнай алімпіядзе ў Маскве і тым, што яна ідзе ў самых буйных гарадох Савецкага Саюзу на розных мовах Савецкага Саюзу. Пралетары Харкава, Масквы, Растову і іншых гарадоў галасуюць за «Гуту», вораг біты дасягненьнямі пралетарскай літаратуры і тэатру.

Зусім нядаўна пралетарская літаратура ўнесла яшчэ адзін уклад у тэатральнае мастацтва п'есай «Качагары» Гурскага. Але і гэта п'еса зноў сустрэлася з прыяцелямі з «нацыянал-апартуністычнага шляху». Хто-ні-хто імкнуўся абвінаваціць п'есу ні ў чым іншым, як у тым, што яна ня наша (?!) і нават дагаварваліся да «мэта згоднасьці (?!) зьняць «Качагары» са сцэны. Гэтым малайцом рашучы адпор нанесла пралетарская грамадзкасьць, якая галасавала за «Качагары», як за пралетарскую пастаноўку. Камуністычны друк нанёс канчатковы ўдар па нападках на пастаноўку, ЦО нашай партыі газэта «Зьвязда» правільна ацаніла «Качагары», дапамагла аўтару—маладому драматургу выправіць рад недахопаў і памылак.

Мы не пералічваем фактаў барацьбы вакол такіх пастановак, як «Першая Конная», «Бронецягнік» і інш. перакладныя п'есы, мы гаворым толькі аб беларускіх арыгінальных пастаноўках, якія дае пралетарская літаратура. Паказаныя факты гавораць за тое, што пралетарская літаратура зна ходзіцца на правільным шляху ў галіне абслугоўваньня тэатральнага мастацтва. Але тут нельга праходзіць моўчкі міма тых недахопаў і прарываў, якія ёсьць. Першым і галоўным недахопам зьяўляецца зусім недастатковая ўвага з боку пралетарскай літаратуры далейшаму разьвіцьцю беларускага пралетарскага тэатральнага мастацтва. Нашы пісьменьнікі яшчэ не далі ніводнай п'есы такім тэатрам, як Дзяржаўны вандроўны тэатр, маладым баявым Трамам, рабочаму тэатру і нацыянальным вандроўным тэатрам. Гэтыя тэатры абслугоўваюць ты сячы рабочых і калгасьнікаў. Ім патрэбны заўсёды жывыя актуальныя п'есы, якія-б мабілізавалі масы на барацьбу за скончэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Тут бязумоўна прарыў, на ліквідацыю якога трэба ўзьняць пісьменьнікаў і прыцягнуць новыя сілы з ліку літгурткоўцаў фабрык і заводаў.

Як у галіне тэатральнага мастацтва, так і ў галіне кінематаграфіі мы маем добрыя прыклады пралетарскага мастацтва. Кінакарцінамі «Нянавісьць», «Рубікон», «Сонечны паход» і часткова «У ваннi народжаная» мы разгра мілі «Его превосходительство» і «Кастусь Каліноўскі», далі адпор скажэньням ролі пралетарыяту і яго партыі, што было адбіта ў іншых ідэалёгічна нявыразных карцінах «Хвоі гамоняць», «Гатэль Савой». Але «Нянавісьць», «Рубікон», «Сонечны паход»—гэта довы пачатак, які неабходна замацоўваць і разьвіваць. Ім пачаўся пераломны этап у разьвіцьці беларускай кінематаграфіі, іх значымасьць для мастацтва вялікая.

Беларуская мастацкая літаратура павінна шырэй разгарнуць сцэнарную творчасьць, узмацоўваць пралетарскую кінематаграфію. Тут зноў пралетарская літаратура павінна мець вядучую ролю, яна павінна ўпарта змагацца за пралетарскі зьмест кіно.

Зусім слабым месцам у галіне сувязі літаратуры з іншымі відамі мастацтва—зьяўляецца сувязь літаратуры з музыкай. На музычным фронце ідзе разгорнутая барацьба. Асабліва гэта адчуваецца ў БССР, дзе музычны фронт яшчэ слабы, дзе (на музычным фронце) буржуазная, нацыянал-дэмакратычная ідэалёгія яшчэ ня выкрыта да канца, у барацьбе з варожымі плынямі ў музыцы трэба яшчэ шмат зрабіць. Вопыт барацьбы за гегемонію пралетарскай літаратуры мы павінны перадаць і нашым таварышом з музычнага фронту, дапамагчы ім біць буржуазных і нацыянал-дэмакратычных ідэалёгаў у музыцы, дапамагчы змагацца з цыганшчынай, факстротшчынай і халтурай.

Але ня толькі з гэтага будзе складацца брацкая таварыская дапамога стварэньню пралетарскай музыкі, яна ўключае ў сябе і практычную работу пісьменьніка сумесна з кампазытарам і музыкантам. Возьмем толькі адзін, два прыклады гэтай сумеснай работы. Мы ідзем на дэманстрацыю, праводзім час адпачынку, ідзем з работы і вельмі часта адчуваем, што няма ў нас масавай новай песьні з моцнымі словамі і моцнай па сваёй музыцы. Значэньне такога сьпеву бясспрэчна вялікае. У нас ёсьць добрыя сьпевы і па словах і па мэлёдыі, якія створаны на фабрыках, калгасах, але іх трэба апрацоўваць, шліфаваць, узбагачаць словамі і апрацоўваць музычна, каб яны зрабіліся масавымі новымі сьпевамі. Гэта справа—пісьменьніка і кампазытара, за гэтую справу трэба ўзяцца з энтузіязмам.

Мы рыхтуем і ня дрэнна новыя сілы, створана і працуе опэрная студыя, якая ўжо дала першую пастаноўку опэры «Залаты Пеўнік». Пастаноўка як першая спроба ў разьвіцьці беларускай опэры, праходзіць здавальняюча. Ёсьць сілы, ёсьць уменьне мастацкі аформіць пастаноўку, але няма яшчэ новых слоў таму і бяруць «Залаты Пеўнік» і працуюць над ім. Беларускай опэрнай студыі трэба даць новую опэру, даць новы зьмест опэрнага твору, а гэта справа нашай літаратуры і, у першую чаргу, пралетарскай.

Шматграннасьць сумеснай работы літаратуры і музыкі вялікая і багатая ў сваім выніку. Літаратура і музыка павінны аб'яднаныя сіламі ствараць новае пралетарскае музычнае мастцтва.

Ня меншы па сваёй значнасьці ёсьць разрыў паміж літаратурай і выяўленчым мастацтвам. Праўда, тут БелАПП і РОМБ у свой час заключылі саюз сумеснай работы, але зноў гэта толькі пачатак перадачы вопыту барацьбы за пралетарскае мастацтва.

БелАПП і Фэдэрацыя аб'яднаньняў савецкіх пісьменьнікаў павінны больш рашуча павярнуцца тварам да іншых галін мастацтва, быць застрэльшчыкам распрацоўкі раду пытаньняў у галіне творчага мэтаду асобных галін мастацтва, наладжваць аб'яднаныя вечары, выторчыя нарады, пасылаць аб'яднаныя брыгады на прадпрыемствы і г. д. Поўным комплексам мерапрыемстваў літаратура павінна быць шчыльней увязана з іншымі галінамі мастацтва.

Пралетарская літаратура тут павінна мець вядучую ролю, бо яна ёсьць перадавы атрад на фронце барацьбы за пралетарскае

„Камунарка", дабіся пераламу і перамогі!

З усёй рашучасьцю ліквідаваць абязьлічку, укараніць адзінаначальле, увесьці гаспадарчы разьлік, аўладаць тэхнікай

Рабочыя „Камунаркі", вышэй сьцягі сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Пералом ёсьць, але не дастатковы

У гор. Менску два месяцы таму назад у лік 518 уступіла цукерачная фабрыка «Камунарка». «Камунарка» абсталявана машынамі вырабу нашых заводаў, вытворчая магутнасьць фабрыкі вялізарная. Фабрыка ўжо ў гэтым годзе павінна даць гатовай прадукцыі на 24 мільёны руб. Але фабрыка пакуль не апраўдала тых задач якія былі ўскладзены на яе партыяй і ўрадам. Фабрыка знаходзіцца ў глыбокім прарыве па выкананьні прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Прамфінплян за першае паўгодзьдзе фабрыкай «Камунарка» выкананы на 67,4 проц. Квартальны плян у другім квартале выкананы на 48,8 проц., самы глыбокі прарыў прыпадае на чэрвень, апошні месяц другога кварталу, у якім плян выкананы толькі на 28,3 проц.

Абязьлічка, адсутнасьць тэхнічных ведаў і гаспадарчага разьліку

Чым тлумачыць, што ўдарная фабрыка, якая перавыконвала пляны раней, апынулася ў такім ганебным прарыве?

Першая прычына гэта тое, што партыйны і камсамольскі калектыў, дырэкцыя і фабком слаба падрыхтавалі рабочых да пераходу ў новае памяшканьне, не азнаёмілі ў дастатковай меры рабочых з новымі машынамі і варштатамі, не разгарнулі работы за аўладаньне тэхнікай на новых машынах.

Другая прычына—ня ўведзена адзінаначальле, не ліквідавана абязьлічка, машыны, варштаты і сыравіна не замацаваны за брыгадамі, за канкрэтнымі выканаўцамі. Яшчэ на сёньняшні дзень рабочыя перакідаюцца з варштата на варштат, з адной брыгады ў другую. Брыгадныя і зьменныя майстры таксама абязьлічаны і ні за што не адказваюць.

З гэтай прычыны варштаты, машыны і абсталяваньне знаходзяцца ў бяспрытульным становішчы. У цэхах панае бруд, не захоўваюцца элемэнтарныя правілы санітарыі і гігіены. Павялічваецца брак, былі выпадкі, што ў аднэй брыгадзе за адну зьмену было 125 кілё браку.

Месяц таму назад, былі заключаны дагаворы паміж цэхамі і канторою аб пераходзе на гасразьлік і складзены адпаведныя акты. Але гасразьлік і да гэтага часу застаўся не даведзеным канчаткова да цэху, агрэгату брыгады.

Няма працдысцыпліны—ёсьць лягунства і рвацтва

Прагулы на фабрыцы набылі масавы характар. Яны наглядаюцца ня толькі ў паасобных рабочых, але гуляюць і цэлымі брыгадамі. Напрыклад, брыгада т. Альперовіча цалкам ня выйшла на работу. Рабочыя, работніцы і часткова члены КП(б)Б і ЛКСМБ адмаўляюцца выконваць распараджэньні брыгадзіраў, зьменных і цэхавых майстраў. Былі выпадкі, калі камсамолец адмовіўся чысьціць машыну.

На фабрыцы наглядаецца лягунства і рвацтва. У адным толькі маі месяцы пакінула фабрыку звыш 40 рабочых, ёсьць такія выпадкі, калі прагульшчык прыходзіць да загадчыка цэху і заяўляе: «Я зрабіў тры прагулы. Згодна правіла ўнутранага распарадку, давайце мне разьлік як прагульшчыку», або «Дасі 150 р.—дык буду працаваць, а не дасі—кіну фабрыку».

Апартуністы і рвачы супраціўляюцца перагляду норм выпрацоўкі

Члены КП(б)Б Бэйлін, ён-жа сакратар цэхячэйкі КП(б)Б, Шылер і Карапачакідзэ, а таксама 2 кандыдаты партыі з закрутачнага аддзяленьня выступілі супроць новых норм выпрацоўкі на цэхавых вытворчых нарадах па абгаварэньні норм. (У мякка-шакаладным цэху да прыняцьця норм выпрацоўкі 7 тон гатовае прадукцыі, а пасьля таго, як былі прыняты нормы, дык выпрацоўка зьнізана да 4-х тон). Трэба адзначыць, што партыйцы і камсамольцы сустрэлі моўчкі новыя нормы выпрацоўкі і не падтрымалі адміністрацыю, не далі належнага адпору рвачом і правым апартуністам, якія выступалі супроць норм.

Фабком у баку ад сацспаборніцтва

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыцы знаходзіцца ў занядбадзе. Няма вучоту спаборнічаючых паміж сабой брыгад і цэхаў. Сацспаборніцтвам фабком ня кіруе. Тыя дасягненьні спаборніцтва і ўдарніцтва, якія былі яшчэ ў старым памяшканьні не замацаваны пры пераходзе ў новае памяшканьне.

Поўная адсутнасьць вярбоўкі рабочай сілы

Вярбоўкай рабочае сілы ніхто на фабрыцы не займаецца. Дырэкцыя спасылаецца на тое, што біржа працы не пасылае рабочых. Работа па самазамацаваньні рабочых за фабрыкай зусім не распачата. У фабкоме няма вучоту самазамацаваных, нават няма і тых зьвестак, колькі самазамацаваных пакінулі работу на фабрыцы.

Да гэтага часу яшчэ не арганізаваны яслі. Зусім ніякай выхаваўчай работы не праводзіцца сярод рабочых фабрыкі, а асабліва новага папаўненьня. У цэхах фабрыкі адсутнічаюць плякаты і лёзунгі, якія адбівалі-б сучаснае становішча фабрыкі (барацьбы за прамфінплян, з лягунствам, рвацтвам, прагуламі і г. д.).

Шматтыражка не зрабілася „вострай зброяй" у барацьбе за прамфінплян

Шматтыражка «Камунарка» таксама мала змагалася за выкананьне прамфінпляну. Рабкоры не мабілізаваны, не згрупаваны вакол шматтыражкі на барацьбу за прамфінплян. Што да нас цэнгазэт, дык асобныя з іх даўно ўжо ня выпушчаліся. Газэта карамельнага цэху ня выходзіла на працягу 34 дзён, апошні нумар вышаў 19-VII і то бяз удзелу рэдкалегіі. Дарэчы трэба дадаць і тое, што за тэрмін 3-х месяцаў зьменена ўжо 3 рэдактары шматтыражкі.

Усё гэта гаворыць за тое, што партработа на фабрыцы не перабудавана па новаму. Цэхячэйкі і партарганізатары яшчэ ня сталі на чале рабочых у барацьбе за прамфінплян.

Мендзяржбуд ня выканаў умовы аб сваячасовай перадачы будынку фабрыкі. Не пабудавана кантора, клюб—сталоўка, ясьлі, пажарнае дэпо і інш. З прычыны адсутнасьці памяшканьня пад канцэлярыю і фабрычныя арганізацыі занята плошча, якая фактычна прызначана цахом і для рабочых.

Цепласанцэстрой да гэтага часу ня скончыў мантаж па прадпы параправодаў і перабудоў выкорыстаньня вэнтыляцыі. Тая работа, якая і скончана, праведзена нядбайна і безадказна. Трубы псуюцца амаль кожны дзень, ад чаго бываюць прастоі па некалькі гадзін.

Ударніца ф-кі «Камунарка» т. Аляксеева, вылучана для работы на ф-цы па хранамэтражу як прыкладная работніца. Прэміравана.

Трэст Белсельхарпраму нядбайна падышоў да прыёмкі фабрыкі ад Мендзяржбуду, будынак быў прыняты з дэфэктамі, якія садзейнічаюць зрыву прамфінпляну.

У справе плянаваньня вытворчае праграмы трэст выказаў поўную блытаніну. Праграма зьмянялася 3 разы. Адсутнічае жывое кіраўніцтва фабрыкай. Тэхнагляд ажыцьцяўляецца толькі тады, калі здарыцца якая-небудзь непаладка, толькі ў той час інспэктары трэсту зьяўляюцца для складаньня акту.

Забесьпячэньне фабрыкі сыравінай праходзіць бясплянава. У другім квартале была патрэба ў соі у колькасьці 8 вагонаў, а даслалі толькі 2 і то ўжо папсутай. А ў трэцім квартале ў першыя дні завезена 6 вагонаў соі і 3-месячны запас цукру.

Сэктар кадраў НКПрацы не забясьпечыў фабрыку папаўненьнем рабочай сілы і ня вызначыў раёнаў з якіх патрэбна вярбаваць рабочую сілу для фабрыкі.

Гарпрафсавет і ЦП саюзу мукамольнай і цукернай прамысловасьці зусім не аказвалі дапамогі ў перабудове прафсаюзнай работы на фабрыцы. ЦП саюзу толькі 19-VII на прэзыдыуме ЦП слухала даклад фабрыкі «Камунарка» аб выкананьні прамфінпляну за другі квартал.

Месячнік штурму бяз мас

Парт. і камсамольскім калектывамі і фабкомам быў абвешчаны месячнік штурму ліквідацыі прарыву з 15 чэрвеня па 15 ліпеня. Але гэты штурм—месячнік рэальных вынікаў ня даў. Толькі адзін бісквітны цэх перавыканаў прамфінплян на 123 проц., а мякка-шакаладны і карамельны цэхі засталіся з прарывамі. Прычына гэтаму—недастаткова былі мабілізаваны рабочыя масы на ліквідацыю прарыву. Гэта мерапрыемства ня было падтрымана вышэйстаячымі кіруючымі арганізацыямі, як трэстам Белсельхарпраму і гарпрафсаветам і ЦП саюзу мукамольнай і цукернай прамысловасьці. Фактычна фабрычныя арганізацыі гатаваліся ва ўласным саку.

Поруч з гэтым, трэба адзначыць і тое, што на фабрыцы недастаткова папулярызуюцца вопыты работы лепшых ударных брыгад, якія выконваюць і перавыконваюць заданьні прамфінпляну як брыгады: камсамольская, тав. Каперштока, ударная брыгада моладзі прыкладнай прадукцыі, тав. Тайц. і інш.

Новы склад бюро калектыву КП(б)Б бачучы такія ганебныя вынікі месячніка штурму па ліквідацыі прарыву тэрмінова прыняў рашучыя меры. У першай палове ліпеня была прапрацавана прамова т. Сталіна на цэхавых партсходах, на агульна-фабрычным партыйна-камсамольскім сходзе і вынесены адпаведныя рашэньні.

Гэтая масавая прапрацоўка прамовы Сталіна мабілізавала партыйна-камсамольскую арганізацыю фабрыкі і ўвесь склад рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрасаналу.

Месячнік штурму працягнуты да 10-VIII і вынік гэтага ёсьць. Прамфінплян на ліпень месяц выкананы на фабрыцы на 112,2 проц., а на дахах выкананьне мае наступны малюнак:

Бісквітны цэх прамфінплян перавыканаў на 125 проц., мякка-шакаладны—119 проц., карамельны цэх—93,2 проц. Такім чынам у хвасьце цягнецца карамельны цэх.

Фабрыка ліпеньскі прамфінплян выканала, але яшчэ не ліквідавала прарыў.

Зараз перад фабрыкай стаіць задача ліквідаваць прарыў (1064,8 тон гатовае прадукцыі краіна павінна атрымаць). Ліквідаваць абязьлічку па ўсіх вучастках работы, канчаткова давесьці гасразьлік да цэху, брыгады і наладзіць кантроль рублём. Нанесьці рашучы ўдар правым апартуністам, лягунам прагульшчыкам і тультаём.

П. В.

Рахунак бісквітнага цэху трэба выканаць

Пры абвяшчэньні месячніка штурму па ліквідацыі прарыву на фабрыцы «Камунарка» (15-6—15-7) нашаму бісквітнаму цэху было дана заданьне—даць 105 тон гатовае прадукцыі.

Каб выканаць гэтае заданьне, якое некаторым здавалася непамерным, мы правялі адпаведную падрыхтоўку. Кантрольную лічбу абгаварылі ў цэхпартячэйцы, склікалі нараду цэхтрыкутніка. Пасьля гэтага мы склікалі нараду II брыгады (зьмены). Дэталёва абгаварылі кожную канкрэтную работу і норму кожнага брыгадзіра.

Дзякуючы такому мэтаду масавага абгаварэньня нормаў і заданьня цалкам II-я брыгада прыняла нормы і высунула сустрэчны прамфінплян на 110 тон гатовай прадукцыі і выклікала на сацспаборніцтва 1-ю брыгаду (зьмену).

1-я брыгада з энтузіямам прыняла выклік II-й брыгады і высунула сустрэчны на 6 тон больш, альбо 116 тон. Такім чынам абедзьве брыгады высунулі сустрэчны плян даць 116 тон гатовае прадукцыі.

Брыгады заключылі паміж сабою сацспаборніцтва на выкананьне і перавыкананьне сустрэчнага пляну. Рабочыя былі расстаўлены па канкрэтных работах, устаноўлены самакантроль у брыгадах як за колькасьцю, так і за якасьцю.

Энтузіязм і энэргія рабочых пераматлі. За 26 дзён цэх даў 116 тон гатовай прадукцыі, а за ўвесь чэрвень 128 тон 746 клм. альбо 129 проц. заданьня. Праўда, не абышлося і бяз дэфэктаў. У працэсе работы заўважылі, што пачала паніжацца норма выпрацоўкі. Мы адразу, на ходу склікалі вытворчую нараду майстраў сумесна з брыгадзірамі і нарады трыкутнікаў брыгад. Усе заўважаныя непаладкі мы ліквідавалі, зноў выпрацоўка прадукцыі пашла ўверх.

Другой перашкодай у рабоце было тое, што адсутнічала тара і атрымаўся залеж гатовае прадукцыі. Моладзь па сваёй ініцыятыве сумесна з старымі рабочымі склалі на дабрахвотных пачатках 3-ю зьмену (3-я зьмена ў бісквітным цэху ня ўведзена) для загатоўкі скрынак. За ноч была зроблена адпаведная колькасьць скрынак, прадукцыя спакавана і адпраўлена па прызначэньні.

За час ударнага месячніка была праведзена праверка сацспаборніцтва паміж брыгадамі. Праведзена некалькі нарад трыкутнікаў з ст. брыгадзірамі па праверцы вырабу прадукцыі зьменамі.

Непасрэдна ў брыгадах уведзены самакантроль сваячасовай яўкі рабочых на работу. Дзякуючы гэтаму мы дабіліся таго, што прагулы зьніжаны да мінімуму. За ўвесь месяц было ўсяго 4 прагулы і то з боку аднаго Іванова, злоснага прагульшчыка, п'яніцы і хулігана, аб учынках якога ёсьць раёнае цэхавых арганізацый і агульнага сходу рабочых.

Трэба адзначыць, што мы працуем у надзвычайна дрэнных умовах. Памяшканьне цэху падвальнае і цеснае, без адпаведнай санітарнай і вытворчай гігіены. Раней у гэтым памяшканьні працавала 30—40 чалавек, а цяпер звыш 80.

Аднак, ня гледзячы на ўсе перашкоды, цеснату памяшканьня, недахват тары, частага псаваньня цестамяшалак, недахвату бляшаных лістоў, адсутнасьці вэнтыляцыі мы з гонарам выканалі і перавыканалі нават сустрэчныя нормы.

Энтузіязм, рабочых і адданасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам цэхпартарганізацыі пры актыўным удзеле яе, рабочыя бісквітнага цэху высока будуць несьці чырвоны сьцяг да новых перамог у барацьбе за 5 у 4.

Для яшчэ больш пасьпяховага выкананьня нормаў, мы прад'яўляем наступны рахунак цэхавай адміністрацыі і дырэкцыі фабрыкі:

1. Прыняць рашучыя і тэрміновыя меры да пераводу цэха ў новае памяшканьне.
2. Моць запас частак да цестамяшалак.
3. Забясьпечыць цэх патрэбнай колькасьцю лістоў.
4. Тэрмінова ўстанавіць гігіенічную вэнтыляцыю.
5. Забясьпечыць цэх спэцвопраткай.
6. Цэхадміністрацыі больш чула адносіцца да прапаноў рабочых і сваячасова выконваць пастановы цэхавых партпрафарганізацый.

Выкананьне гэтага адміністрацыяй яшчэ больш дасьць магчымасьць рабочым бісквітнага цэху для барацьбы за сустрэчны плян.

Мы ўпэўнены, што бісквітчыкі дадуць сустрэчны яны не застановяцца на дасягнутым, каб утрымаць фабрычны чырвоны сьцяг у бісквітным цэху.

Ступіна.

Тав. Дуброўская. За добрасумленную, прыкладную працу, за перавыкананьне норм выпрацоўкі—прэміравана.

За зрыў насьценгазэты

п'яніцы-хуліганы Іваноў, Ігнатковіч, Еўтухоўскі і Таран павінны быць суровы пакараны

23 ліпеня ўначы ў ленкутку бісквітнага цэху фабрыкі «Камунарка» былі сарваны амаль ўсе допісы з цэхавай насьценгазэты. Гэты ганебны, клясава-варожы ўчынак зроблены злосным прагульшчыкам і п'яніцаю Івановым, які падгаварыўшы камсамольцаў Ігнаткові ча, Еўтухоўскага і Тарана (начнога вартаўніка) наладзіў п'янку ў ленкутку.

Гэтая п'яная кампанія разьюшылася ў гульні да таго, што ленкуток прывяла ў няпрыстойны выгляд, а ўрэшце сарвала насьценную газэту.

Бязумоўна, што зрыў газэты зроблены капцюрамі клясавага ворага—злоснага прагульшчыка, лодыра і п'яніцы Іванова, які ня толькі парушаў унутраны распарадак, але пачаў разлагаць перыкладных рабочых на вытворчасьці, камсамольца Ігнаткові ча.

Гэты факт яшчэ лішні раз гаворыць аб тым, што камсамольская арганізацыя недастаткова вяла выхаваўчую работу сярод камсамолу і рабочае грамадзкасьці. Толькі таму магло здарыцца, што клясавы вораг змог зьбіць з правільнага шляху трох камсамольцаў.

Рабочая грамадзкасьць сказала сваё слова аб гэтай вылазцы клясавага ворага, зараз чарга за комсамольскім калектывам фабрыкі і фабкомам. Грошцана такім камсамольцам ,якія паддаліся на вудачку клясавага ворага і дазволілі сабе апутаць.

Рабочая грамадзкасьць фабрыкі «Камунарка» павінна нанесьці рашучы ўдар па клясавым ворагу, шкодніку, зрыўшчыкаў прамфінпляну і разбуральніку працдысцыпліны.

В. П.



Выгляд насьценгазэты бісквітнага цэху пасьля таго, як парацавала рука клясавага ворага Іванова.

Вон з саюзу агентаў клясавага ворага

Рэзалюцыя

Заслухаўшы паведамленьне рэдактара шматтыражкі тав. Ступінай аб зрыве заметак з насьценнай газэты, агульны сход рабочых асуджае гэты антырабочы ўчынак з боку рабочых Іванова, Ігнатковіча, Еўтухоўскага, Тарана і ганьбіць іх як ворагаў пралетарскай крытыкі і самакрытыкі і пралетарскага друку.

Выходзячы з гэтага сход рабочых лічыць патрэбным выключыць іх з саюзу і зьняць з работы, як п'яніц і дэзарганізатараў унутранага распарадку і дысцыпліны. Сход рабочых, прапануе фабкому наладзіць над імі грамадзкі суд. Сход лічыць неабходным аб гэтых ганебных учынках даведаць рабочых усіх цахоў фабрыкі.

Як працуе мая брыгада

(КАРАМЕЛЬНЫ ЦЭХ).

— Мая брыгада налічвае 12 чалавек мужчын і жанчын. Мы ў брыгадзе заўсёды мелі ніякі процант вырабу прадукцыі як па колькасных, таксама і па якасных паказчыках. Фактычна мы ня ведалі як выконваюцца нормы выпрацоўкі нашага агрэгату. Пасьля таго як мы атрымалі нормы, я склікаў вытворчую нараду, дзе першым пытаньнем абгаварылі становішча працдысцыпліны.

Другім пытаньнем абгаварылі норму выпрацоўкі для ўсяго агрэгату, высунутую цэхадміністрацыяй. Норма была дана вырабіць карамелі 3.000 кілё. На гэтым не супакоіліся і высунулі сустрэчную норму якая перавышала на 100 кілё. Такім чынам наша норма цяпер складаецца 3.100 кілё ў адну зьмену.

Пачынаючы з 19 ліпеня наша брыгада не паніжае тэмпаў, а нават перавыконвае сустрэчную норму. Праўда, ёсьць выпадкі, калі брыгада па некалькі кілё ня выконвае норму, але гэта бывае па прычыне незалежнай ад брыгады. Напрыклад, з вакумапаратаў не дадуць сваячасова цукру і кожны 5-хвілінны прастой лінейнае машыны аднімае ад нас 60 кілё гатовае прадукцыі.

У барацьбе за выкананьне і перавыкананьне нормы выпрацоўкі, у брыгадзе ўведзена сыстэма вытворчых нарад праз кожныя 3 дні.

Брыгада з вялікім энтузіязмам узялася за ліквідацыю прарыву. Асабліва ў гэтым правілі сябе пом. брыгадзіра т. Ермашкевіч, прафорг т. Пашкоўскі і брыгадзіры жанчыны т.т. Бабровіч, Шынчонак і Камісарава. Гэтыя таварышы першыя выказаліся за рэальнасьць нормы, прынялі прапанову аб сустрэчнай норме. Гэтыя таварышы сапраўды па бальшавіцку, з ўсёй адданасьцю змагаюцца за выкананьне нормы.

Поруч з гэтым трэба адзначыць, што цэхпарт'ячэйка аказала належную дапамогу і правяла адпаведную растлумачальную работу ў брыгадзе. Але брыгада не атрымала ніякай дапамогі з боку цэхпрафкамітэту асабліва з боку старшыні камітэту тав. Рэвэка.

Лічу што было-б няправільным гаварыць аб дасягненьнях не памянуўшы аб недахопах. Недахопы ў рабоце наступныя:

адсутнасьць патрэбнай колькасьці сьвежага паветра, з прычыны чаго карамель доўга ня можа застыгнуць і псуецца; не хапае бачкоў і халодных сталоў, што не дае магчымасьці больш шырака разгарнуць работу і прымушае рабіць залішнюю работу з гатовай прадукцыяй.

Для таго, каб зьнішчыць адзначаныя недахопы, я прапаную наступныя мерапрыемствы, якія магчыма правесьці на фабрыцы без вялікіх затрат: 1) устанавіць матор для вытворчай вэнтыляцыі ў карамельным цэху; 2) дадаць да кожнага агрэгату ў карамельным цэху па адным сталу і павялічыць колькасьць бачкоў, 3) устанавіць мэханічныя мяшалкі ў цыропных чанах.

Капэрштук.

Пазыка „3 рашаючы"—у масы

У жніўні--завяршыць кампанію пазыкі

Аршанскі гарсавет ня стаў на чале барацьбы па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы

Калгасьнікі! Бярэце на буксір адстаючых аднаасобнікаў

Тэрмінова ліквідаваць прарыў

Учора а 12-й гадзіне ў памяшканьні Наркамфіну адбылася нарада старшынь Райфа 16 раёнаў: Прапойскага, Веткаўскага, Вушацкага, Лёзьнянскага, Талочынскага, Краснапольскага, Дубровенскага, Шклоўскага, Клічаўскага, Лепельскага, Церахоўскага, Чачэрскага, Бягомльскага і Тураўскага. Гэтыя раёны у выкананьне пляну мабілізацыі грашовых сродкаў за 3-ці квартал бягучага году маюць сур'ёзныя прарывы.

Нарада ставіла сваёй мэтай высьвятліць тыя прычыны якія абумовілі сабою гэты прарыў. Пасьля заслухоўваньня прадстаўнікоў з месц, нарада канстатавала, што галоўнай з гэтых прычын зьяўляецца адсутнасьць пляну-навай сыстэматычнай работы з боку раённых арганізацый ў справе мабілізацыі сродкаў.

На нарадзе выявілася, што раённыя арганізацыі па радзе раёнаў не змаглі забясьпечыць кіраўніцтвам работу мясцовых арганізацый і ўстаноў (сельсаветаў, ашчадкас і інш.). Апрача гэтага на нарадзе выявілася, што і самі раённыя арганізацыі ня здолелі дабіцца адзінага пляну ў правядзеньні такой адказнейшай задачы, як справа выкананьня фінпляну.

Выходзячы з гэтага нарада канстатавала неабходнасьць ў далейшым—ажыцьцёвіць наступнае: дабіцца ўвязкі ў рабоце паміж раённымі арганізацыямі, забясьпечыць жывое кіраўніцтва работай вясковых арганізацый і ўстаноў, укамплектаваць адпаведнымі працаўнікамі райфінчасткі, мабілізаваць увесь раённы актыў з мэтаю кінуць яго ў вёску, каб праз гэта дабіцца тэрмінова рашучага пералому на адзначаным вучастку работы.

С.

У Гомелі да афармленьня падпіскі не падрыхтаваліся

Афармленьню пазыковай падпіскі прыдаецца вялізнае значэньне, аднак па г. Гомлі гэта праца праходзіць недастатковымі тэмпамі. Апарат Горвыканкамасы і Дзяржбанку недастаткова гібка працуе, каб сваячасова забясьпечыць 100 проц. афармленьне падпіскі. Па становішчы на 1-е жніўня з ліку 305 прадпрыемстваў і ўстаноў, у якіх падпіска складала 4.015 тыс. р., заяўкі да афармленьня сабраны толькі ад 207 адзінак на суму 2550 тыс. р.

Гэткае становішча стварае пагрозу, што ў Гомлі, дзе падпіска была праведзена раней ўсіх гарадоў БССР, афармленьне поўнасьцю праведзена ня будзе. Значна тармозяць гэтую справу таксама асобныя камсоды і адміністрацыя прадпрыемстваў, якія «марынуюць» у сабе падпісныя лісты. Неабходна афармленьне падпіскі паведзьці тымі-ж тэмпамі, якімі праходзіла падпіска, каб першы ўзнос на апошняй паступіў поўнасьцю з зарплаты за 1-ю палову жніўня.

Разам з тым неабходна адзначыць, што да гэтага часу крэдытныя ўстановы ня скончылі раздачу аплачаных аблігацый першага выпуску пазыкі «Пяцігодка».

Што да становішча рэалізацыі пазыкі на вёсцы, дык апошняе зусім незадавальняючае. У той час, як па гораде заданьне выкапана на 104 проц., па калгасным сэктары на 121 проц., па аднаасобным сэктары рэалізацыя пазыкі праходзіць зусім незадавальняюча. Тлумачыцца гэта тым, што прамадзкасьць да 25-га ліпеня не была мабілізавана, арганізацыйна-масавай растлумачальнай работы на вёсцы ня было, а камсоды і фінансава-юрэдытны апарат ня здолелі сваячасова разгарнуць кампанію. Неабходна перабудаваць работу так, каб поўнасьцю выканаць заданьне на вёсцы і забясьпечыць 100 проц. афармленьне падпіскі.

Гурскі.

У Крупскім раёне не вядзецца растлумачальная работа па падпісцы на пазыку

У Крупскім раёне аб рэалізацыі пазыкі трэцяга рашаючага году пяцігодкі ня ведаюць масы. Аб гэтым сьведчыць той факт, што падпіска па калгасным і аднаасобным сэктары амаль не распачата.

Да гэтага часу ні райкамсод, ні РВК, ні райком партыі, ні райпрафсавет, ніхто з раённых арганізацый не займаўся кампаніяй рэалізацыі пазыкі. Сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў растлумачальнай работы не праводзілася. Асабліва адстае ў падпісцы аднаасобны сэктар.

Тут нават ні ў аднэй вёсцы гэта кампанія не праводзілася, у выніку чаго падпіска сарвана. Крупскі раён павінен у хутчэйшы тэрмін рэалізаваць падпіску сярод калгаснага сялянства і аднаасобнага сэктару вёскі. Сельсаветы, рабселькоры, ашчадкаса, гэта ваша справа. Пакладзеце канец самацёку.

Селькор.

Брыгада сыгналізуе

Сакратар парт'ячэйкі і старшыня Юр'еўскага сельсавету нежадаюць праводзіць падпіскі сярод сялян

Юр'еўскі сельсавет, Смалявіцкага раёну, самы адсталы па рэалізацыі пазыкі трэцяга рашаючага. Да гэтага часу не праведзена падпіска сярод рабочых і служачых, нават сам сельсавет не палічыў патрэбным падпісацца.

У сельсавеце ніякіх даных аб ходзе падпіскі няма. Няма падзяленьня заданьня па сэктарах і калгасах у паасобку. Аднаасобнікі зусім не закранутыя падпіскай. Аблігацый па сельсавеце аказалася на 2-VIII усяго на 80 руб., а заданьне 17.900 руб. За ўвесь час банк прыслаў аблігацый на 900 руб. і на гэтым заспакоіўся. Партыйная і камсамольская ячэйкі нічога не зрабілі, толькі правядзеньнем падпіскі сярод сябе.

Правядзеньне сходу сярод аднаасобнікаў было сарвана сакратаром парт'ячэйкі Казыро і старшынёй сельсавету тав. Кручынскім, якія заявілі: «Мы людзі занятыя і нам няма калі займацца такой справай як рэалізацыя пазыкі, у нас справы паважней, гэтай справай павінны займацца ўпаўнаважаныя, ватым вас і прыслалі. Дзякуючы такому кіраўніцтву нам прышлося ісьці ў вёску праводзіць сход без прадстаўнікоў сельсавету. Камсамолец тав. Люданскі зьбег са сходу.

Ня лепш справа абстаіць і ў вёсцы Сутоках, Юр'еўскага сельсавету. У гэтай вёсцы трэба было правесьці сход, але член сельсавету Макарэвіч замест таго, каб сабраць сялян на сход... напіўся п'яным і лёг спаць.

Мы патрабуем неадкладна прыняць належныя меры да такіх членаў сельсавету. Разам з тым адзначаем актыўную работу камсамольца саўгасу «Антанопль» тав. Сабалеўскага, які дапамагаў нам у рабоце. Дапамог нам у рабоце калгас «МОПР», які складаецца з 10 двароў і падпісаўся на 40 руб. Індывідуальныя двары: Грыш кевіча Міх. і Смаровіча Міх. падпісаліся кожны на 60 руб., а таксама добра правёў падпіску калгас «Дзень Парыскай Камуны», які складаецца з 13 двароў і падпісаўся на 555 руб. Калгас «Ураджай», вёскі Антанопль цягнецца ў хвасьце; ён складаецца з 29 двароў, а падпісаўся усяго на 100 руб., што складае 26 проц. заданьня.

Брыгада Наркамфіну. электразаводу і «Савецкай Белаўсі»

Стратановіч, Шырман.

Калгасы Боркавіцкага с.-савету адстаюць у падпісцы

З 9 калгасаў Баркавіцкага сельсавету зьвесткі аб падпісцы на пазыку маюцца толькі па двух калгасах, але зьвесткі гавораць аб адсутнасьці патрэбнай працы ў напрамку рэалізацыі пазыкі ў гэтых калгасах.

Калгас «Росьвіт»—44 двары, 84 працаздольных, камсоду няма, падпіску праводзілі шэфы—рабочыя чыгуначнікі станцыі Боркавічы і, дзякуючы таму, што ўстаноўка была дадзена на набыцьцё аблігацыі толькі за гатоўку, падпіска дала ўсяго 160 руб., або ў сярэднім па 3 р. 65 к. на двор. Крыху лепшае становішча па-калгасу «Луч рэвалюцыі», дзе на 18 двароў, пры 30 працаздольных падпіска дала 150 р. Па астатніх 7 калгасах вестак няма.

Сельская камісія садзейнічаньня ніякай працы ня праводзіла, дзякуючы бязьдзейнасьці старшыні сельсавету Гарбачэнка.

М. П.

Ухвальскі лесазавод у падпісцы адстае

Па Ўхвальскім сельсавеце Крупскага раёну падпіска на пазыку 3-га рашаючага прайшла пад знакам выкананьня і перавыкананьня заданьняў. Усе ўстановы Ўхвальскага сельсавету падпісаліся на поўны месячны аклад і некаторыя ўстановы, як, напрыклад, Ухвальскае сельспажыўтаварыства шляхам саспаборніцтва, падпісалася на 150 проц. свайго заработку за выключэньнем Ухвальскага лесазаводу, які толькі падпісаўся на 58 проц. Па сельсавеце рэалізавана пазыкі на сёньняшні дзень на 11.730 руб. замест вызначаных 8.000 руб. Сярод сялянства пазыкі рэалізавана за гатоўку на 1.105 руб. Датэрмінова паступаюць узносы за падпіску.

Праводзіцца работа сярод сэзонных рабочых.

А. С. Прохараў.

Работы сярод аднаасобнікаў па падпісцы не вядуць

Віцебск. 5-VIII. (Белта). Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы» па горадзе і сельсаветах выканана на 107,8 проц. Вёска дала 102,3 проц. Наперадзе ідзе калгасны сэктар, Віцебскі сельсавет па калгасным сэктары замест 4.500 руб. рэалізаваў 7.760 руб. Калгас «Капачова» перавыканаў заданьне па рэалізацыі пазыкі на 50 проц., але дрэнна тое, што ня ўсе аднаасобнікі ахоплены падпіскай на пазыку. У гэтых адносінах зроблена зусім мала.

Аршанскі Гарсавет у баку ад рэалізацыі пазыкі

Яшчэ 27 чэрвеня—гэта значыць больш месяца таму назад, пленум Аршанскага Гарсавету вынес пастанову, якой абавязваў усіх членаў Гарсавету прыняць самы актыўны ўдзел у распаўсюджваньні пазыкі «Трэцяга рашаючага» сярод неарганізаванага на сельніцтва гораду. Гэтай пастановай кожнаму члену Гарсавету дадзена за даньне завярбаваць ня менш 15 падпішчыкаў на пазыку. Аднак да гэтага часу пастанова пленуму Гарсавету засталася на паперы і амаль усе члены Гарсавету за справу рэалізацыі пазыкі яшчэ і ня браліся. Большасьць членаў Гарсавету не жадае выканаць узяты на сябе абавязак і лічаць, што рэалізацыя пазыкі,—гэта ня іх справа. А прэзыдыум Гарсавету і ня цікавіцца тым, як выконваецца пастанова пленуму членамі Гарсавету. Праўда 17 ліпеня ён вынес пастанову аб папярэджаньні членаў Гарсавету што яны будуць адказваць за невыкананьне пастановы пленуму і на гэтым заснуў.

Толькі два члены Гарсавету—Жабракова і Хэйфец паказваюць узорныя бальшавіцкія прыклады ў рабоце па распаўсюджваньні пазыкі. Яны завярбавалі 129 падпішчыкаў на пазыку сярод неарганізаванага насельніцтва на агульную суму 1560 руб., з якіх ужо 261 руб. спагналі.

А. Сёмкін.

Дэлегаткі Малькоўскага сельсавету наперадзе

У выніку добрай пастановы работы сярод жанчын Малькоўскага сельсавету, Мсьціслаўскага раёну, апошнія прымалі вельмі актыўны ўдзел у рабоце сельсавету і ў правядзеньні розных гаспадарчых і палітычных кампаній.

Так, напрыклад, жанчыны значна дапамаглі ў правядзеньні розных загатовак. Жанчыны-дэлегаткі падзяліўшыся на брыгады, рабілі падворныя абыходы бядняцка-серадняцкіх двароў і асабіста даводзілі кожнаму бедняку і серадняку аб значэньні і неабходнасьці загатовак.

У выніку актыўнасьці жанчын кампанія загатовак прайшла па сельсавеце добра. Арганізоўваючы чырвоныя абозы па здачы лішкаў, жанчыны адначасова практыкавалі арганізацыю спэцыяльна «жаночых» абозаў.

У часе веснавой сяўбы жанчыны-дэлегаткі арганізоўвалі брыгады па праверцы работы калгасаў і дапамагалі калгасам у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы, пераходзе на зьдзельшчыну і г. д.

У калгасах жанчыны-актывісткі зьявіліся барацьбітамі са старымі рэлігійнымі забабонамі. У часе рэлігійных сьвят жанчыны выходзілі арацъ на калгасныя палі і прыкладам ударнай работы цягнулі за сабой мужчын.

Гэткімі мэтадамі жанчыны дабіліся ліквідацыі прарываў у веснавой сяўбе ў калгасе «Чырвоны Трактар».

Жанчыны актывісткі арганізавалі апрача гэтага праверку работы сельсавету, прымаюць удзел у правядзеньні ўборачнай кампаніі і падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы.

А. Квяткоўская.

Удой за паперу

5-га жніўня фабрыка «Спартак» паказала далейшае палепшаньне ў выкананьні прамфінпляну. За гэты дзень усе тры папяровыя машыны далі 84,6 проц. пляну (у той час калі 4-га жніўня толькі 63,4 проц.). Фабрыка магла-б дасягнуць 100-процантнага выкананьня, калі-б ня было вытворчых непаладак. Сёньня згарэў матор з папяровай машыны. Гэта сьведчыць аб нядбайных адносінах з электра-абсталяваньнем.

Неабходна наогул рэзка паставіць пытаньне аб тэхнічным кіраўніцтве і наглядзе на фабрыцы. Апроч таго, што некаторыя рабочыя недастаткова падрыхтаваны да выкананьня ўскладзеных на іх абавязкаў па даглядзе за электра-маторамі, на фабрыцы яшчэ няма выпрацаваных правіл абыходжаньня з імі, няма дастаткова наладжанага тэхнічнага нармаваньня.

5-га жніўня прастой машын зьменшыўся напалову, а іменна дайшоў да 12 проц. Аднак, па іншых паказьніках перадому яшчэ няма. Брак яшчэ мяецца. Якасьць паперы, асабліва філігранай, пакідае жадаць шмат лепшага.

Каландры яшчэ ня пушчаны ня гледзячы на абяцаньне заводакіраўніцтва пусьціць іх 5-га.

Ня вылучаны спэцыяльны чалавек для нагляду за якасьцю, у форме тэхнічнага кантролю і прыёму прадукцыі. А адсутнасьць такога кантролю апарату рэзка адбіваецца на якасьці прадукцыі. Вельмі ня добра абстаіць з пастаноўкай харчаваньня на фабрыцы. Сталовая дае рабочым нізка-якасныя абеды. Закрыты разьмеркавальнік Шклоўскага райспажыўтаварыства забясьпечвае вельмі дрэнна, а калі часамі прывозяць прамтавары, дык робіцца нячуваная накідка для «акругленьня» цэн. Трыкутнік фабрыкі суленьня» цэн. Трыкутнік фабрыкі сумесна з брыгадай газэты «Савецкая Беларусь» паставілі перад раённымі арганізацыямі пытаньне аб палепшаньні рабочага забясьпечаньня.

Высунута пытаньне аб пераводзе сталовай на гасразьлік, аб адкрыцьці закрытага рабочага кааперативу.

Неабходна паставіць перад Белкаапсаюзам пытаньне аб вылучэньні фабрыкі «Спартак» у сэнсе забясьпечаньня на 2 сьпіс, а не па 3 як зараз.

Грамадзкасьць фабрыкі ўключылася ў барацьбу за выкананьне пляну, аднак «раскочваньне» працягваецца вельмі доўга.

Гарын.

Аб мэдпуньку на скурзаводзе „Бальшавік"

Прывычка—другая натура. Калі ў пачатку 1930 г. на скурзаводзе «Бальшавік» (Менск) быў арганізаваны мэдпуньк—далёка ня ўсе рабочыя туды зварочваліся за дапамогаю. Матыў быў наступны:

— Я ніколі ня быў у мэдпункце. Пайду дадому, а адтуль у Камароўскую амбуляторыю.

Але паступова мэдпункт пачаў заваёўваць аўтарытэт. Калі рабочаму т. Почце рэйковачная машына ўдарыла ў грудзі, калі ў т. Іванова адарылася нячысьце з нагой, калі т. Астроўскаму воз з дровамі прыціснуў галаву і калі названым таварышом была тэрмінова, тут-жа на заводзе, аказана мэдпунктам дапамога—тады ўсе навочна ўявілі сабе значэньне мэдпункту на заводзе.

Ні адзін дзесятак рабочых і служачых заводу «адрамантаваў» у мэдпункце ў высокакваліфікаванага доктара т. Нэйфаха свае зубы, тым самым з'эканоміўшы сотні гадзін на хаджэньне і чаканьне ў амбуляторыі.

Пры мэдпункце даўно арганізавана дыэтычная сталоўка, у якой хворыя пры дапамозе патраў з расійска-беларускімі назвамі больш пасьпяхова лечаць свае «хваробы», чымся лякарствамі, прыпісанымі латыньню і дзесяткавымі дробямі. Харчаваньне ў дыэтсталоўцы да гэтага часу было добрае, як кажа хворы, і «па смаку здаровага чалавека». Недахоп падсобнай майстэрні мэдпункту, г. зн. дыэтсталоўкі—абмежаваная колькасьць абедаў (75) і не каторае пагоршаньне (ў апошні час) якасьці абедаў.

За невялікі пэрыяд часу было пераведзена мэдпунктам на больш лёгкую работу 65 рабочых, страціўшы часовую працаздольнасьць. 9 чалавек храмічна хворых пераведзены на сталую больш лёгкую работу. Мэдпунктам зроблена поўнае мэдабсьледаваньне рабочых цэхаў, з вучотам усіх хворых, вядзецца барацьба за захаваньне санітарнага мінімуму.

Калі адміністратару баліць жывот ці члену заўкому галава, тады ён успамінае пра мэдпункт.

— Здароў, доктар. Дайце такое, каб адразу адлягло. А пасьля... забываюцца. Сацыяльна-бытавы сэктар працуе «ціханька» Сэктар цікавіцца пастаноўкай мэдабслугоўваньня на Марсе, але не работай заводзкага мэдпункту. Калі адміністрацыя другога хромавага цэху адносна лёгка згаджаецца на пераход хройкаў (хворых хранічнымі хваробамі) на больш лёгкую работу, дык адміністрацыя 1-га хромавага цэху ўпіраецца:

— Пераводу ня хочам, дайце хвораму... водпуск.

Да гэтага часу ня выканана прадпісаньне мэдпункту аб пераводзе хворых т. т. Лабачэўскага і Пагоцкага—старых байцоў за прамфінпляк (працуючых у 1-м і 2-м хромавым цэхах)—на больш лёгкую работу.

Справаздача аб рабоце мэдпункту ніколі ня ставілася на рабочым сходзе, на паседжаньні заўкому. У мэдпункце няма дзяжурства дактароў—хоць-бы раз у дэкаду—па спэцыяльных хваробах. Калі вы хварэеце спэцыяльнаю хваробаю—скажам вуха, носа і горла—вы можаце атрымаць у мэдпункце толькі першую дапамогу, а абмінуць амбуляторыю не заўсёды абмінеце. Гэта кепска.

Кепска тое, што ў нас і да таго часу адсутнічае сувязь навукі і вытворчасьці. У Менску ёсьць БДУ і Мэдінстытут. Ёсьць навуковыя працаўнікі і вучоныя ад мэдыцыны. Чаму-б ім не зацікавіцца, хоць-бы з чыста навуковага пункту гледжаньня, работай мэдпункту на прадпрыемстве?

Гаворыць, што некаторыя вучоныя для таго, каб напісаць дысэртацыю забіраюцца на высокія горы таго архіпелагу, ў якога ёсьць адна агульная назва «тэорыя». Іншы задаецца мэтаю вывучыць якія вынікі былі-б, каб афрыканская хвароба заехала на Беларусь. Але ці ня лепш узяць пад «навуковы абстрэл» мясцовыя хваробы альбо тое ка рыснае, што мы на справе, а не абстрактна маем ад заваёвы рабочай клясы—мэдпунктаў на прадпрыемствах.

М. Н.

ГАРОДНІНУ — пралетарскім цэнтрам

Разгрузіць склады, выратаваць гародніну!

Рацыянальна арганізуем садова-гародную кааперацыю

Пастанова Каркамзему і Наркамснабу пра рэарганізацыю садова-гароднай кааперацыі ў БССР

У выкананьне пастановы Савету Народных Камісараў БССР за 4 ліпеня г. г. пра рэарганізацыю садова-гароднай кааперацыі Наркамзем і Наркамснаб пастанаўляюць:

1. На Белсадгародсаюз усклясьці наступныя функцыі:

а) правядзеньне кантрактацыі садавіны, ягад, гародніны, бульбы і пчалапрадуктаў;

б) арганізацыю загатовак садова-гародняй і пчалярнай вытворчасьці, бульбы, лясных ягад, грыбоў і розных іншых другарадных прадуктаў і сыравіны;

в) арганізацыю тэхнічнай перапрацоўкі садавіны, ягад і гародніны праз спэцыяльна ўтвораны ў складзе Садсаюзу камбінат на гаспадарчым разьліку;

г) загатоўку і забясьпячэньне пасадачных матар'ялам і насеньнем садова-гародных культур;

д) пабудову ў мясцох загатовак хавальнікаў для садавіны і бульбы;

е) загатоўку тары і ўпаковачных матар'ялаў.

2. Правядзеньне ўскладзеных на Белсадгародсаюз задач ажыцьцяўляецца на мясцох праз раённыя канторы Белсадгародсаюзу, якія адкрываюцца апошнім па ўзгадненьні з Наркамземам і Наркамснабам, як у раёнах са спэцыялізаваным садова-гародным напрамкам, так і ў іншых раёнах, па меры выяўленьня ў іх матар'яльнай базы для работы Белсадсаюзу.

3. Склады з сельска-гаспадарчымі машынамі і штучным угнаеньнем, якія ёсьць у Белсадсаюзе і ў рэарганізуемых у канторы райкаапсадсаюзаў, перадаць сельгаснабу і ўсесаюзнаму абяднаньню штучных угнаеньняў.

4. Для абслугоўваньня калгасных гасадарак садова-гароднага і пчалярнага напрамку арганізаваць пры Белкалгасцэнтры беларускае аддзяленьне Садгародкалгасцэнтру СССР, усклаўшы на яго апэрацыйна-выканаўчыя функцыі.

5. Ускладзеныя на беларускае аддзяленьне Садгародкалгасцэнтру задачы ажыцьцяўляюцца на мясцох у раёнах садова-гароднага напрамку праз райкалгасаюзы гэтых раёнаў у цэлым, а ў астатніх раёнах, дзе ёсьць значная колькасьць калгасных садова-гародных і пчалярных гаспадарак і ўмовы для пашырэньня садова-гародняй вытворчасьці,—праз упаўнаважаных Белкалгасаддзяленьня, якія ўводзяцца па ўзгадненьні з Наркамземам і Белкалгасцэнтрам.

6. Абавязаць Белсадгародсаюз у трох дзённы тэрмін перадаць беларускаму аддзяленьню Садгародкалгасцэнтру агравытворчы пэрсанал, які працуе ў цэнтры і на мясцох.

7. Абавязаць Белкалгасцэнтр скончыць арганізацыю беларускага аддзяленьня Садгародкалгасцэнтру ў пяцідзённы тэрмін і падаць на зацьверджаньне Наркамзему палажэньне аб яго дзейнасьці і штатах.

Упарадкаваць завоз гародніны

Апошнія дні далі значны наплыў бульбы і гародніны ў Менск.

Адной раньняй бульбы на складах МЦРК ёсьць звыш 40 вагонаў.

Аднак, ня гледзячы на гэта, назіраецца абсалютная непаваротлівасьць таваразраводнай сеткі да рэалізацыі гэтай гародніны. Дырэктывы партыі і ўраду наконт пашырэньня крам, ларкоў і г. д. для максымальнага разьмеркаваньня бульбы і гародніны сярод спажыўцоў ня выконваюцца.

Ужо маюцца сымптомы нарастаньня леташніх памылак.

Балкаагародніна, і Белсадгародніна, і МЦРК павінны прыняць захады да выкананьня дырэктыў аб пашырэньні гандлёвай сеткі па гародніне да вызначаных норм.

Белсадгародніна абавязана безадкладна наладзіць рэгуляваньне завозу бульбы і гародніны ў Менск шляхам дачы адгружаючым раёнам цьвёрдых норм завозу бульбы і гародніны з разьлікам поўнага задавальненьня Менску.

Тэндэнцыю многіх крам ухіляцца ад продажу бульбы і гародніны па прычынах грамодзкасьці гэтага тавару трэба зламаць самым рашучым чынам.

Дырэкцыя Белсадгародніны апартуністычна зрывае падрыхтоўку тары

Тара цяпер мае асаблівае значэньне таму, што зараз у поўным разгары загатоўчы сэзон і несвячасовая, недастатковая падрыхтоўка да гэтае кампаніі тары, можа паставіць пад пагрозу зрыву яе пасьпяховае правядзеньне.

Гэта асабліва выразна павінны ўявіць сабе кіраўнікі Белсадгародніны. Але-ж сапраўды той хаос, тая неразьбярыха, якія існуюць у Белсадгародніне ў азначанай галіне работы яскрава сьведчыць аб тым, што яна і на сёньняшні дзень не разумее, ці ня хоча разумець сваіх функцый і абавязкаў. Таму і атрымалася, што справа падрыхтоўкі тары мае такое катастрафічнае становішча.

Згодна плянавых меркаваньняў па сыстэме Белсадгародніны павінна быць загатоўлена для ўсіх відаў садгародніны 120.000 штук бочак. Але што маецца сапраўды? На гэтае запытаньне працаўнік сэктару тары тав. Ягораў проста адказвае: «Аб тым, колькі бочак ёсьць, колькі не капае, хто робіць іх, калі і ці будуць яны знойдзены—ніхто ня ведае, а тая колькасьць бочак, якая на сёньняшні дзень ёсьць, нават і ў малай ступені ня можа забясьпечыць агульную патрэбнасьць у іх».

Адгрузка раньняй бульбы ў асноўным была забясьпечана мяшкамі. Але далейшая яе адгрузка павінна праводзіцца пры дапамозе вагонаў (гэтак званая адгрузка «навалам»). Для гэтае мэты неабходна падрыхтаваць поўным чынам адпаведную колькасьць вагонаў, але гэтага ня зроблена.

Ня лепш і са скрынкамі для яблык. Згодна пляну іх патрэбна 714.000 шт. З іх маецца—40.000 штук старога запасу, захаваннага па лініі Лесбелу—70.000 шт., Садгародніна павінна зрабіць—100.000 шт. Але лічбы гэтыя (апроч 40.000 старога запасу) папяровыя, бо на сёньняшні дзень скрынак фактычна няма і калі будуць яны—сэктар тары Белсадгародніны—пэўна ня ведае.

Гэтыя лічбы паказваюць бюракратычнае німгога «неделание» Белсадгародніны ў справе забясьпечаньня тарай прыёму садгародніх прадуктаў у бягучым годзе.

Прычыны такога становішча перш за ўсё ў тым, што на лініі Белсадгародніны адсутнічае ўсякая апэрацыйнае кіраўніцтва справай загатоўкі тары на мясцох, адсутнічае сталы кантроль за выкананьнем нарадаў адпаведнымі арганізацыямі (Лесбелам і інш.). Па-другое, таму, што ў Белсадгародніне адсутнічае ўсякі вучот патрэбнасьці тары і яе фактычнай колькасьці.

Дырэкцыя на ўсе напамінкі працаўніка сэктару тары т. Ягорава аб катастрафічным становішчы на азначаным вучастку работы, адказвае маўчаньнем. Больш таго, калі т. Ягораў спрабаваў асабліва настойліва патрабаваць тых або іншых мерапрыемстваў, дырэкцыя адказвае яму: «Сядзь це на сваё месца», ці яшчэ—«Прыедзе дырэктар і зробіць што трэба, а мы зараз нічога ня ведаем», так адказвае намесьнік дырэктара тав. Субач. Дырэктар-жа тав. Хавіч пасьля прыезду ў сваю чаргу адказвае тав. Ягораву: «дзяк кожнага сэктару свой час...».

У выніку такіх адносін да справы з боку дырэкцыі адзіны работнік у сэктары тав. Ягораў, які павінен працаваць фактычна ў якасьці агента па г. Менску, зьбіраецца кідаць працу. Ён заяўляе: «я пастаўлен у такія ўмовы, пры якіх працаваць абсалютна нельга, бо ніякай дапамогі, ні ад кого я не атрымліваю, а адзін на ўвесь сэктар працаваць не магу». І гэта зусім зразумела, бо зараз тав. Ягораў выконвае ўсе абавязкі адзін, без належнай дапамогі, як з боку дырэкцыі, так і іншых сэктароў Белсадгародніны.

Неабходна ўсе гэтыя прарывы выправіць на хаду. Трэба забясьпечыць адпаведную ўвязку ў рабоце сэктароў, як унутры самой канторы Белсадгародніны, так і з раённымі канторамі.

Без адпаведных мерапрыемстваў справа падрыхтоўкі тары, а значыць і загатоўкі садагародных прадуктаў бясспрэчна будзе сарвана.

Брыгада «Сав. Беларусі»:

А. Сідарэнка, Боска, Лось.

Тэрмінова

Усім ФЗМК, рабочкомам і гаспадарнікам

У сувязі з прадстаўнымі пераглядамі плянаў і кантыгентаў снабжэньня, неабходна безадкладна (не пазьней 13-VIII) абавязкова прадставіць ГСПС (пляц Волі, былое памяшк. НКПраны) зьвесткі аб фактычай колькасьці рабочых (першага і другога сьпісаў) і колькасьці адпускаемых Наркамснабам пайкоў. Зьвесткі павінны быць заверены Дырэкцыяй і ФЗК. Тэрмін прадстаўленьня канчатковы.

ГАРПРОФСАВЕТ.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Цалкам рэалізаваць лётарэйныя білеты Чырвонага Крыжу

Прэзыдыум ЦК Чырвонага Крыжу БССР, адзначыў, што рэалізацыя білетаў лётарэі Чыр. Крыжу праходзіць **нездавальняюча.**

Гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі недаацэньваюць палітычнага значэньня лётарэі.

На сёньняшні дзень рэалізавана білетаў усяго на 30.000 рублёў, у той час як патрэбна рэалізаваць на 500.000 руб.

Улічваючы тое, што апошні тэрмін па рэалізацыі білетаў 1-га кастрычніка, ЦК Чырвонага Крыжу даў дырэктывы ўсім гаркомам і раённым камітэтам Чырвонага Крыжу аб узмацненьні работы па рэалізацыі білетаў лётарэі.

Усе інструктары ЦК Чырвонага Крыжу мабілізаваны ў раёны для аказаньня практычнай дапамогі раённым арганізацыям па ўзмацненьні работы ячэек Чырвонага Крыжу і рэалізацыі лётарэйных білетаў.

Адначасова ЦК Чырвонага Крыжу просіць ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ даць сваім арганізацыям дырэктывы аб узмацненьні работы на месцах па рэалізацыі лётарэйных білетаў Чырвонага Крыжу.

15-га жніўня склікаецца гарадзкая канфэрэнцыя членаў Чырвонага Крыжу

Менскі Гарадзкі камітэт Чырвонага Крыжу 15-га жніўня склікае агульна-гарадзкую канфэрэнцыю членаў Чырвонага крыжу.

Па правядзеньні канфэрэнцыі створана арганізацыйная камісія якая ўжо прыступіла да практычнай падрыхтоўкі да канфэрэнцыі.

Па фабрыках і заводах праводзяцца даклады, аб далейшым росьце ячэек Чырвонага Крыжу.

На канфэрэнцыі будзе заслухан даклад аб задачах ячэек Чырвонага Крыжу ў пэрыяд санацыяністычнага будаўніцтва, даклад гарадзкога камітэту Чырвонага крыжу аб яго рабоце.

Канфэрэнцыя абярэ дэлегатаў на Ўсебеларускі Зьезд членаў Чырвонага Крыжу.

15-га жніўня будзе наладжаны агульна-гарадзкі мітынг вайсковых часьцей і членаў ячэек Чырвонага крыжу прысьвечаны рабоце канфэрэнцыі.

500 руб. у фонд пабудовы самалёту „Васьмі"

№ батальён даведаўшыся аб сьмерці васьмі на заўтра-ж наладзіў суботнік у карысьць пабудовы самалёту імя «Васьмі».

Удзельнікі суботніку ўсе аб'явілі сабе ўдарнікамі. Зароблена за адзін суботнік 500 руб. 75 кап.

ЖУК.

Ратуйце сьвіней

У Бярэзінскім раёне ў шмат калгасах сьвіньні гінуць ад чумы. У калгасе «Камунар» (Нагост) і «Перамога» (Капланцы) загінула шмат сьвіней. ВЭТЭПО правяла злачынную нядбайнасьць у справе барацьбы з эпізоотычнымі захворваньнямі сьвіней. Супроцьчумная прышчэпка прыбыла ў раён праз дзьве дэкады пасьля таго, як хворыя сьвіньні прапалі.

Вэтэрынар ВЭТЭПО Бранавец зусім ня цікавіцца сваёй справай. Бранавец ставіць няправільныя дыягназы. Замест супроцьчумнай прышчэпкі сьвіньням была падпушчана сыроватка супроць чырвонкі, у выніку гэтага сьвіньні загінулі.

Вэтэрынара Бранаўца, па віне якога прапала шмат сьвіней, трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Р.

Будзем змагацца за абарону СССР

БАБРУЙСК. (Белта). 1-га жніўня ў гарадзкім садзе адбыўся мітынг, прысьвечаны міжнароднаму чырвонаму дню. Прысутнічала звыш 6 тысяч працоўных.

На мітынгу рабочыя прадпрыемстваў рапартавалі аб сваіх дасягненьнях ў выкананьні прамфінпляну ў рэалізацыі пазыкі, падрыхтаванасьці да абароны краіны.

На мітынгу рабочыя заявілі, што ў выпадку нападу буржуазіі на СССР, будуць біцца да апошняй каплі крыві, а не аддадуць Савецкага саюзу, буржуазіі ў нявольніцтва.

Вынікі работы Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатру пад кіраўніцтвам тав. Галубка ў лягерах МВА

Тэатр быў накіраваны НКА для абслугоўваньня працоўных гор. Масквы і лагераў Маскоўскай вайсковай акругі на тэрмін паўтара месяцы.

З вялікай зацікаўленасьцю сустрэлі тэатр рабочыя Масквы і з яшчэ большай чырвонаармейскія часьці.

Увесь час тэатр працаваў ударнымі тэмпамі, даючы паказы ў самых звычайных прымітыўных умовах—у лесе ка падмостках і без падмостка, на пляцоўках машын-аўтамабіляў і на баявых выездах разам з Чырвонай арміяй у полі. Паказы акуратна наведвалі вялікай колькасьцю радавых чырвонаармейцаў і начскладу, якія з захапленьнем глядзелі дасягненьні пралетарскага мастацтва БССР.

Усе паказы мелі характар паказаўмацнаў. Іх дадзена 45. У шматлікіх прамовах і водзывах чырвонаармейцы і начскладу выказвалі свае шчырыя пажаданьні, каб працоўныя тэатры Беларусі часьцей прыяжджалі ў брацкія рэспублікі для абслугоўваньня Чырвонай арміі і рабочых.

Нежэй мы падаем адзін са шматлікіх водзываў аб рабоце тэатру.

«Беларускім Дзяржаўным вандроўным тэатрам пад кіраўніцтвам народнага артыста Галубка ў Яраслаўскай групе дадзена 5 паказаў.

Праграма паказаў, выкананая на белмове, вельмі зразумела чырвонаармейцам і карысталася вялікім посьпехам. Выступленьні тэатру відавочна паказвалі рост нацыянальнага пралетарскага мастацтва, служылі палітычным актам сувязі чырвонаармейцаў і начскладу з працоўнымі Савецкай Беларусі. Выступленьні тэатру ва ўсіх часьцях канчаліся мітынгамі, на якіх чырвонаармейцы і начскład Яраслаўскай лягернай групы прасілі БАВТ перадаць шчырае чырвонаармейскае прывітаньне рабочым і бядняцкаму сялянству Беларусі».

Нач. Яраслаўскага Дому Чырвонай арміі Сізоў.

А.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР	Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева **Чайхана ў горах** Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.
Дзяржц ЦЫРК	1-шы раз у БССР **белыя палярныя мядзьведзі** Макс і Але саадр клёўны. Стійя дрэсіраваных коняў ЛАПІАДА Паветраны палёт ВАЛЕНЦІНІ 2 Сазоновы 2 з паршом Тік-Так акробаты эксцэнтрыкі Пач. а 8 гадз. 45 хвіл. Льготныя білеты ў рабкасе
Кіно-тэатр Культура	З 8-га жніўня новы мастацкі фільм **„Дзяржаўны чыноўнік"** у гал. ролі Рогожын
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	Дуглас Фэрбенкс у карціне **ТРЫ МУШКАЦЕРЫ** Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	2 сэрыі 3 і 4 у 15 ч. у адзін сэанс **Стэнлей у нетрах Афрыкі** Пачатак а 2, 3-45. Вач. а 7, 8-45 і 10-30 г.
„Чырвоная Зорка"	Першы гукавы мастацкі фільм **Пуцёўка ў жыцьцё** Драма ў 34 эпізодах

СТАНІСЛАЎСКАЯ ШКОЛА „САЎГАСВУЧ"

З ДВУМЯ АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ

(жывёлагадоўчае і вэтфэльчарскае)

абвяшчае

ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА 1-ШЫ КУРС

па 25-VIII—31 г.

Прымаюцца асобы ўзростам ад 14 да 18 год, якія скончылі поўны курс 4 груп сямігодкі, без іспытаў.

Ня скончыўшыя 4 груп ПАДЛЯГАЮЦЬ ІСПЫТАМ.

Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакумэнты:

1. Анкета па форме ўстаноўленай для тэхнікумаў, засьведчаная савецкай установай, або профарганізацыяй.
2. Аб узросьце (мэтрычная выпіс).
3. Аб адукацыі.
4. Даведка аб стане здароўя.
5. Даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы: а) для сялян—акладны ліст; б) для калгасьнікаў—даведка аб уступленьні ў калгас.
6. Даведка аб праве выбарчага голасу.

У гэтым навучальным годзе будзе прынята 90 асоб. З іх с.-гасп. рабочых—70 проц. Усе вучні будуць забясьпечаны інтэрнатам і стыпэндыяй ад 18 да 35 руб.

Заявы накіроўваць па адрасу: *Саўгас Станіславова, Дубровенскага раёну, загадчыку школы „Саўгасвуч".*

Да заяў прыкладаць на 30 кап. паштовых марак для адказаў аб прыёме ў школу.

Загадчык школы АБРАМЕНКА.

Беларускі Дзяржаўны Універсытэт

АБВЯШЧАЕ **АСЕНЬНІ НАБОР** СТУДЭНТАЎ

на наступныя факультэты:

1. Фізыка-матэматычны (белар. і яўр. сэкцыі). 2. Хімічны (беларуская сэкцыя)

Заявы прымаюцца да 20-га жніўня г. г. у канцэляры БДУ (Менск, Універсытэцкі гарадок, галоўны корпус).

Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Правілы прыёму абвешчаны ў даведчыку НКА.

70 проц. прынятых студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Для сямей студэнтаў БДУ кватэр не прадстаўляе.

Аб тэрміне пачатку заняткаў з новым наборам будзе ПАВЕДАМЛЕНА АСОБНА

ЧВП Рэктара БДУ **В. Рудніцкі**

БЫХАЎСКАЯ ШКОЛА БУДВУЧ

(б. профтэхшкола мэталістых)

АБВЯШЧАЕ **ПРЫЕМ АСЕНЬНЯГА НАБОРУ**

СТУДЭНТАЎ НА 120 ЧАЛАВЕК

Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігадовыя політэхнічныя школы, ці маючыя дна-адна веды.

Курс навучаньня двухгадовы. Усе прынятыя ў Будвуч забясьпечваюцца зарплатай у залежнасьці ад паступовага набыцьця кваліфікацыі, выходзячы з 25 да 40 рублёў, а таксама і інтэрнатам.

Прыём заяў будзе праводзіцца з 7 па 25 жніўня.

Усе, падаўшыя заявы, падлягаюць абавязковаму мэдагляду, які будзе праведзены 27-28 жніўня.

Умовы прыёму тыя самыя, што і ў тэхнікумы.

гор. Быхаў БССР, Чырвонаармейская, Будвуч.

Сэктар кадраў Белсельбу у

ЗАВОЧНЫ ПЭДІНСТЫТУТ (б. Завочны Пэдфак)

Пры Вышэйшым Пэдінстытуце

— АБВЯШЧАЕ —

АСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

на 1-ы курс у ліку 766 асоб

на Літаратурна-Лінгвістычны факультэт, Сацыяльна-Гістарычны факультэт з аддзяленьнямі гісторыі і эканомікі і Пэдалёгіі, Пэдагогікі і пэдалёгіі.

Прыём заяў да 15 верасьня. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка

Для паступленьня неабходны наступныя дакумэнты; 1) анкета засьведчаная праф. або савец. арг. 2) пасьведчаньне аб скончэньні сярэдняй школы, 3) спраўка аб месцы працы, 4) спраўку аб сацыяльным паходжаньні і выбарчых правох. 5) 2 фатаграфічныя карткі

Прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, сяляне бядняки, сераднякі, служачыя

У заявах трэба ўказаць, на якое аддзяленьне жадаеце паступіць.

Анкета высылаецца па атрыманьні 20 кап. маркамі.

Заявы накіроўваць; Менск, Універсытэцкі гарадок, Завочнаму Пэдінстытуту.

ЗАВОЧНЫ ПЭДІНСТЫТУТ

11 жніўня а 7 гадз. увеч. у памяшканьні Гарсавету (3 паверх)

АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА

бюро дэпутацкіх груп, бюро сэкцый сумесна з сэкратарамі партячэек і старшынямі фабзаўмясцкомаў прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама і ўпаўнаважаных інструктароў.

За поўную і своечасовую яўку адказваюць асабіста сэкратары ячэек.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Аб перабудове масавай працы Гарсавету і далейшых задачах дэпутацкіх груп (дакл. сэкратар ЦВК т. Гніляковіч).
2. Розное.

Тавс вет, Гарпрафсавет, Гарком.

АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРЫЁМ

У ШКОЛУ ФЗВ КУЛІНАРАЎ

у г. Менску

Прымаюцца дзеці калгасьнікаў, бяднякоў і сераднякоў

Задукацыяй ад 5-ці да 7 груп сямігодкі. Узрост ад 14—17 год. Слухачы будуць забясьпечаны стыпэндыяй у разьмеры 25 руб. 20 кап. (першы семестр) і інтэрнатам, а потым стыпэндыя будзе павышана, Харчаваньне ў сваёй майстэрні (кухні). Для паступленьня неабходны наступныя дакумэнты: 1) аб сацыяльным становішчы; 2) аб адукацыі; 3) мэтрычны выпіс. Дакумэнты накіроўваць па адрасу: г. Менск, Нямігa-Ракаўская вуліца № 14. Кухня размеркавальнік № 23.

Прыём заяў да 25-га жніўня.

ФЗВ КУЛІНАРАЎ

Гарпраўленьне саюзу Працасьветы

выклікае на 11-VIII а 12 гадз. дню

Т. Т. ВЫЯЗДЖАЮЧЫХ 11-VIII НА ЛЕСАНАРЫХТОЎКУ:

Урбановіч, Бернштэйн, Гольдбэрг, Зубрыцкая, Рагоўска, Раецкі, Мегла, Лезьнікаў, Чарановіч, Кернажыцкі, Нікіцкі, Малышаў, Баранас, Некрашэвіч, Рак, Дейхунд, Обштэйн, Мінкоў, Левін і Маньковіч,

а таксама і жадаючых паехаць

Гарпраўленьне

Пячатка калгасу „Новы Араты"

Галоўч. с.-с., Пятрыкоўскага раёну,

ЗНОЙДЗЕНА

ЛІЧЫЦЬ САПРАЎДНАЙ

БАБРУЙСКІ ЛЕСПРАМГАС

ПАВЕДАМЛЯЕ,

— што ўсе выданыя —

прыймовыя квіты

на нарыхтоўцы, вывазцы, сплаву і інш. дапаможным працам быўш. Раёнам Лесбелу, будуць прыймацца да аплаты Бабруйскім Леспрамгасам

толькі да 20-га жніўня г. г.

Пасьля паказанага тэрміну ніякіх выплат па прад'яўленых квітох ня будзе

Бабруйскі Леспрамгас

Петрыкаўская прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва

ЛІКВІДАВАНА,

з прычыны зьліцьця з Слуцкай агнятрывалай прафтэхшколай.

Усе справы і дакумэнты перадаюцца Слуцкай прафтэхшколе, куды з 15 жніўня г. г. павінны накіроўвацца ўсе заяўкі вучняў і іншых асоб па розных школьных пытаньнях.

Вучні б. 1-га курсу Петрыкаўскай прафшколы павінны зьявіцца да 1-га верасьня да месца заняткаў у г. Слуцк.

Ліквідацыйная камісія

Нарсуд Хойніцкага раёну, на падставе прысуду ад 13 сакавіка г. г. па арт. 196 К.К., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні калгасу «Сялянін» гр. Радчанка Макару Антонаву, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Хойніцкага раёну, на падставе прысуду ад 9 мая г. г. па арт. 196 К.К., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену Бабчынскага сельсавету, гр. Сакоўскаму Івану Якубаву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Хойніцкага раёну, на падставе прысуду ад 9 сакавіка г. г. па арт. 196 К.К., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. старшыні калгасу «Чырвоная Зьмена» Аніскаўчу Міхалаю Савіну за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Хойніцкага раёну, на падставе прысуду ад 25 сьнежня 1930 г. па арт. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. старшыні калгасу «Баевіч» гр. Фешчанка Івану Паўлаву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Баркавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 12 чэрвеня г. г. па арт. 196 II ч. 195 арт. КК., з санкц. 2 арт. КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну калгасу «Сталіна» Юзаўскага сельсавету аб'ездчыку Дзярнавіцкага Вучлеспрамгасу Ценяраву Алесю Язэпаву, за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў,—6-15. Выдавецтва—2-44.

падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Главлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА